

ПЛАНЫ «БЕЛАВІЯ» 4

ПРАМЯНЁВАЯ ТЭРАПІЯ БЕЗ «ПАБОЧКІ» 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЛІСТАПАДА 2019 г. АЎТОРАК № 214 (29081)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ХАЦЬКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**
*«Мы плануем вырабіць не менш за 10 тысяч тон грэчневых круп і забяспечыць наша насельніцтва. Таксама ёсць пераходзячыя рэшткі з мінулага года. З улікам таго, што крупы пастаянна завозяцца з Расіі, Украіны, не лічым, што будзе нейкая крытычная сітуацыя. У Расіі неўраджай грэчкі, што выклікае ў насельніцтва пэўнае хваляванне, але нічога крытычнага ў гэтым няма».*

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў учора з афіцыйным візітам у Аўстрыю.**
- Інфляцыя ў Беларусі ў кастрычніку склала 0,5 %.
- **Бязвізавыя турысты праяўляюць павышаную цікавасць да адпачынку ва ўстановах аховы здароўя Гродзенскай вобласці.**
- У Беларусі выяўлена 408 радовішчаў прэсных і 246 — мінеральных вод.
- **11 лістапада ў брэсцкім мікрараёне Паўднёвы на тэрыторыі гімназіі № 6 адбылося адкрыццё новай міні-футбольнай пляцоўкі.**
- З-за анамальна цёплай восені ў Гродзенскім раёне заквітнеў рапс.



- **Месцазнаходжанне зніклай у Мінску шасцігадовай дзяўчынкі ўстаноўлена.**

ISSN 1990 - 763X

# А ГАРМОНІК ГРАЕ, ГРАЕ...



**Шмат гадоў актыўна выступае на гарадскіх, раённых і міжрэгіянальных святах, фестывалях і конкурсах ансамбль «Мазырскія гармонікі» з горада над Прыцяццю. Сёлета калектыў, які базіруецца ў мясцовым доме культуры «Будаўнік», удзельнічаў адразу ў дзвюх значных канцэртна-фестывальных імпрэзах пад назвай «Іграй, гармонік». Цяпер музыканты рыхтуюцца да выступленняў на выбарчых участках горада, падбіраюць рэпертуар на калядныя святы.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Працяг тэмы

## МАШЫНАМ ЗНАЙШЛІ МЕСЦА

**«Звязда» дапамагла жыхарам мікразоны Падгорная-Падміколле ліквідаваць стыхійную паркоўку каля гарадской бальніцы ў Магілёве.**



Аляксандр ПІКУЛЯ: «Паглядзіце, які зараз парадак на вуліцы Боткіна».

**Увагу на праблеме завастрыў старшыня вулічнага камітэта гэтай мікразоны Аляксандр Пікуля. Менавіта з ім мы ў канцы чэрвеня прайшліся па вуліцы Боткіна, каб упэўніцца ў тым, што ён не перабольшвае, сцвярджаючы, што вуліцу ператварылі ў сапраўдную паркоўку. «Тут дзве машыны не могуць раз'ехацца, не кажучы пра рэйсавы аўтобус. Летась было чатыры аварыі, дзве з якіх з аўтобусам», — абураўся ён, каментуючы і без гэтых слоў красамоўную карціну. Вузкая вуліца з крутым спускам, застаўленая з абодвух бакоў легкавымі аўто, нагадвала хутчэй паласу перашкод, чым праезную частку.**

СТАР. 9

Фінансы

## ІСТОТНАЙ ІНФЛЯЦЫІ НЕ БУДЗЕ

### Ва ўсякім выпадку, Нацбанк не бачыць прычын для хвалявання

**Пачнём з галоўнага. 6 лістапада адбылося пасяджэнне праўлення Нацбанка па грашова-крэдытнай палітыцы, па выніках якога прынята два асноўныя рашэнні.**

Першае — зніжэнне з 20 лістапада стаўку рэфінансавання з 9,5 да 9 працэнтаў гадавых. Другое рашэнне датычыцца ставак Нацыянальнага банка па аперацыях рэгулявання ліквіднасці банкаў. З першых дзён трэцяй дэкады лістапада стаўка па крэдыце авернайт зніжаецца з 10,75 % да 10 %, па дэпазіце авернайт — з 8,25 % да 8 %.

Пры прыняцці рашэнняў па грашова-крэдытнай палітыцы праўленнем Нацбанка ўлічаны ўвесь комплекс знешніх і ўнутраных умоў, у першую чаргу фактычная і чаканая дынаміка інфляцыі ў параўнанні з мэтавым арыенцірам, а таксама ступенню рэалізацыі праінфляцыйных рызык.

СТАР. 4

Парламенцкі дзённік

# Дэпутаты прапануюць павялічыць дапамогу па беспрацоўі

**У Палаце прадстаўнікоў адбылося першае пасяджэнне міжведамаснай рабочай групы па падрыхтоўцы законапраекта, які прадугледжвае змяненне Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь».**

Праект змяненняў плануецца ўключыць у План падрыхтоўкі законапраектаў на 2020 год. Дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях з'яўляюцца ў гэтым выпадку суб'ектамі заканадаўчай ініцыятывы і працуюць разам з профільным міністэрствам. На пасяджэнні міжведамаснай рабочай групы былі абмеркаваны канцэптуальныя падыходы па ўсіх артыкулах закона, якія прапануецца змяніць.

— Гэта пытанні, якія датычацца павышэння дапамогі па беспрацоўі да памеру пражытачнага мінімуму, — патлумачыла журналістам **старшыня парламенцкай камісіі Тамара КРАСОЎСКАЯ**. — Прапануем змяніць паняційны апарат, падыходы да пераліку асоб, якія пры рэгістрацыі ў цэнтрах занятасці маюць патрэбу ў рэабілітацыі. Мы хочам, каб статус беспрацоўных мелі тыя, хто праходзіў лячэнне ў лячэбна-працоўных прафілакторыях Міністэрства ўнутраных спраў. Каб яны мелі тыя ж правы і гарантыі, што і астатнія беспрацоўныя.

Дэпутаты таксама прапануюць прапісаць у заканадаўстве магчымасць індывідуальнай рэабілітацыйнай праграмы для апошняй катэгорыяй грамадзян. Яшчэ адна прапанова — пашырэнне гарантый у сферы занятасці для сацыяльна ўразлівых катэгорый людзей, такіх як інваліды, шматдзетныя маці і іншыя.

**Першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ** расказаў пра асноўныя змяненні, якія дзяржаўны рэгулятар жадае ўбачыць у праекце закона са свайго боку:

— фінансаванне расходаў па занятасці за кошт рэспубліканскага бюджэту (цяпер крыніца фінансавання — Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва);

— выключэнне пасад па сумяшчальніцтве з базы вакантных;

— дапаўненне паняційнага апарату тэрмінамі «грамадзяне, якія звярнуліся па пытаннях працаўладкавання» і «бронь»;

— рэгістрацыя грамадзян у якасці беспрацоўных па месцы знаходжання;

— пашырэнне пераліку грамадзян, якім дзяржава дае дадатковыя гарантыі занятасці, за кошт асоб, якія завяршылі знаходжанне ў ЛПП, залежных ад псіхаактыўных рэчываў, якія праходзяць індывідуальныя праграмы сацыяльнай рэабілітацыі;

— забеспячэнне права на атрыманне дапамогі па беспрацоўі людзям, у якіх знятая група інваліднасці (цяпер такой магчымасці няма);

— павелічэнне памеру дапамогі па беспрацоўі ў раёнах з напружанай сітуацыяй на рынку працы і для беспрацоўных ва ўзросце больш за 50 гадоў;

— змякчэнне ўмоў па даванні дзяржаўных гарантый у сферы занятасці для інвалідаў, грамадзян, якія вызвалены з месцаў пазбаўлення волі, залежных ад псіхаактыўных рэчываў (не знімаць з уліку ў выпадку невыканання ўмоў службы занятасці, пры гэтым не губляць іх з поля зроку, аказваць максімальнае садзейнічанне па сацыялізацыі);

— захаванне на ўліку па беспрацоўі асоб, накіраваных на перанавучанне, да іх працаўладкавання;

— удакладненне паняццяў «новае рабочае месца», "тэрыторыя з напружанай сітуацыяй на рынку працы», «маніторынг якасці аказання паслуг у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва».

У большасці гэтыя прапановы супадаюць з тымі, якія ініцыююць дэпутаты.

«Думаю, што надышоў час пераглядзець само паняцце «занятасць», зрабіць яго вызначэнне больш шырокім, больш сучасным, — дадала Тамара Красоўская. — Каб яно ахапіла нестандартныя віды работ, самазанятасць, грамадска карысную дзейнасць, догляд дзяцей». Адна з прапаноў дэпутатаў — замяніць паняцце «работнікі, якія знаходзяцца пад пагрозай звальнення» на больш агульнае паняцце «работнікі, якія знаходзяцца ў групе рызыкі звальнення»...

Наступны этап работы над законапраектам — разгляд профільным міністэрствам тых прапаноў дэпутатаў, якія адрозніваюцца ад сфармуляваных спецыялістамі ведамства.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Дажынкі-2019

# ГОДНЫ ВЫНІК ЖНІВА

## на Гомельшчыне быў дасягнуты пры пастаяннай барацьбе з надвор'ем

**Удзельнікаў і гасцей свята ў Рэчыцы прывітальным адрасам павіншаваў Прэзідэнт Беларусі. Кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць усім, хто працуе на палях, фермах і перапрацоўчых прадпрыемствах самай вялікай у краіне Гомельскай вобласці. «Пераканаы, што выкананне тэхналогій і адказнае стаўленне да справы кожнага з вяскоўцаў, ад механізатара да кіраўніка, дапаможа нам вырашыць важныя задачы, якія стаяць перад аграпрамысловым комплексам Гомельшчыны і ўсёй Беларусі», — зачытаў прывітальны адрас старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**



Старшыня Гомельскага аблвыканкама знаёміцца з вырабамі перапрацоўшчыкаў сельгаспрадукцыі.

Для аграрыяў Гомельшчыны 2019 год быў вельмі няпросты з пункту гледжання кліматычных умоў. Ім давялося пераадольваць наступствы то бязлітаснай спякоты, то вельмі нізкай для лета тэмпературы. Вецер і град таксама паўплывалі на канчатковыя вынікі. Загінула каля 5 % пасеваў, дзясятая іх частка была пашкоджана. Між тым сельгасвытворцы вытрымалі гэты экзамен на трываласць. Было сабрана 692 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур. Гэта на 12 % больш, чым летась. З улікам кукурузы агульная вага гомельскага каравая наблізілася да мільёна тон.

— Пакуль раса не ляжа, мы не сыходзілі з поля, — успамінае сёлетняе жніво Мікалай Сышчанка. — Прыходзім раніцай, рыхтуем камбайны і працуем столькі, колькі надвор'е дазваляе.

Старшы камбайнер з КСУП «Ельск» стаў пераможцам абласных «Дажынак» сярод маладзёжных экіпажаў. Малады чалавек працаваў на камбайне КЗС-10К «Палессе» і ўбраў 628 гектараў з умоўным намалотам 1488 тон.

Так, сёлетняе жніво на Гомельшчыне вызначыла новыя прозвішчы перадавікоў і нагадала пра тых, хто не саступае лідарскія пазіцыі. Экіпажы старшых камбайнераў Васіля Ковваля і Івана Вырвіча з агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна штогод становяцца першымі ў вобласці тысячнікамі. 188 экіпажаў намалацілі звыш 1000 тон збожжа. Большасць з іх працуе ў Рэчыцкім раёне. На цырымоніі ўзнагароджання ў Рэчыцы старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей адзначае, што лідарам расце годная змена:

— Сёлета 23 маладзёжныя экіпажы перасягнулі тысячную мяжу па намалоце. Упершыню ў лік тысячнікаў увайшлі сямейныя пары: сужэнцы — Андрэй і Таццяна Бухмілер, Дзмітрый і Валянціна Тарасенкі з Рэчыцкага раёна, а таксама бацька і дачка Сяргей і Настасся Жураў з Брагінскага раёна. У цэлым у вобласці кожны шосты экіпаж мае ганаровае званне тысячніка.

Між іншым, аграрыі рэгіёна нарыхтавалі і неабходную колькасць кармоў для добрай зімоўкі жывёл — па 27,5 цэнтнера кармавых адзінак на ўмоўную галаву. Найлепшым у нарыхтоўцы кармоў прызнаны Ельскі раён. Мазырскі дасягнуў самых высокіх паказчыкаў у жывёлагадоўлі, радуецца **старшыня райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА:**

— Нашы людзі вельмі адказныя. Яны нарошчваюць аб'ёмы вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі жывёлагадоўлі. Ад гэтага наўпрост залежыць іх заробак. Ён сёння ў аграпрамысловым комплексе Мазыршчыны складае 1100 рублёў.

Дарэчы, найлепшым прадпрыемствам сезона па зборы збожжавых прызнаны саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна. Другое месца паміж сабой падзялілі агракамбінат «Холмеч» Рэчыцкага раёна і прадпрыемства «Палессе-Аграінвест» Петрыкаўскага. А вось раёнаў — лідараў па вытворчасці збожжа сёлета вырашылі не вызначаць.

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК**, які быў абраны дэпутатам ад Рэчыцкай акругі № 44, на абласных «Дажынках» адзначыў, што Гомельшчына зрабіла важкі ўнёсак у агульную скарбонку краіны:

— Прыродна-кліматычныя ўмовы, у тым ліку і нізкая бальнасць зямлі, пастаянна прыносяць пэўныя выпрабаванні гэтай паўднёвай вобласці краіны. І ўсё ж Гомельшчына годна трымае марку. Працаўнікі знаходзяць новыя тэхналогіі: напрыклад, першымі ў краіне асвоілі тэхналогію вытворчасці кукурузы як на сілас, так і на зерне. На Гомельшчыне працавітыя людзі, якія вельмі адказна ставяцца да справы і атрымліваюць той вынік, які супастаўны з іншымі абласцямі. Дарэчы, каб яго атрымаць, тут трэба працаваць удвая больш. Я жадаю, каб вашы даходы раслі прапарцыянальна ўкладзенай вамі працы. Ну і добрага надвор'я налета.

Між тым абласному святу ў Рэчыцы з надвор'ем пашанцавала. Таму з вынікамі працы аграрыяў на выстаўцы падворкаў можна было азнаёміцца падрабязна. Вуліцы горада ператварыліся ў адзін вялікі квартал з гандлёвымі і рамеснымі радамі. Дзеці і дарослыя з задавальненнем фатаграфаваліся на фоне сучаснай сельгастэхнікі, дэгуставалі сёлетнюю прадукцыю і шчыра віншавалі ўсіх працаўнікоў аграрнага комплексу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**, *Рэчыца*.
**Фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кітай і ЗША пагадзіліся на паэтапнае зніжэнне пошлін на тавары



Пра гэта паведаміла агенцтва Bloomberg са спасылкай на прадстаўніка міністэрства камерцыі КНР Гаа Фэна. «Калі бакі дасягнуць першай часткі здзелкі, то ў адпаведнасці са зместам пагаднення ўзаемныя павышаныя пошліны павінны быць сінхронна і прапарцыйна адменены, гэта важная ўмова дасягнення пагаднення», — заявіў Гаа Фэн, словы якога прыводзіць РІА «Навіны». Фэн таксама заявіў, што памер зніжэння тарыфаў на першым этапе будзе залежаць ад зместу гэтага пагаднення. Паводле яго слоў, абодва бакі правялі «канструктыўныя перагаворы» ў апошнія два тыдні і працягваюць дамаўляцца аб тым, дзе і калі будзе падпісана пагадненне аб «першай фазе», паведамляе партал ProFinance Service. Першы этап уключае дамоўленасці аб пастаўках амерыканскіх сельгаставараў у КНР, вызначэнні правілаў для прадухілення маніпулявання курсамі валют, мерах па абароне інтэлектуальнай уласнасці і адкрыцці рынкаў КНР для амерыканскіх кампаній.

## Прэзідэнт Балівіі сышоў у адстаўку

Аб сваёй адстаўцы Хуан Эва Маралес Айма заявіў услед пасля ад'езду са сталіцы ў правінцыю Качабамба. Паводле яго слоў, рашэнне пакінуць сваю пасаду ён прыняў для таго, каб «лідары апазіцыі, якія зладзілі пераварот, перасталі спальваць дамы простых людзей». Маралес выказаў надзею на тое, што беспарадкі спыняцца ў найбліжэйшы час. Пры гэтым Маралес паабяцаў не адмаўляцца ад барацьбы і заклікаў лідараў балівійскай апазіцыі «спыніць гэты гвалт». Акрамя яго, у адстаўку падалі віцэ-прэзідэнт краіны Альвара Гарсія Лінера, спікер палаты дэпутатаў Віктар Борда, міністр планавання і каардынацыі Мар'яна Прада, старшыня Вышэйшага выбарчага суда краіны Марыя Эўхенія Чоке, кіраўнік мытнага дэпартамента Марлен Ардая, генпракурор Пабла Дыдэрых, а таксама некалькі сенатараў. Пазней спікер сената Балівіі Адрыяна Сальвацьера, да якой, паводле канстытуцыі, павінна была перайсці ўлада ў краіне, таксама падала ў адстаўку. Беларусь выступае за наладжванне канструктыўнага дыялогу ў мэтах пераадолення ўсіх наяўных супярэчнасцяў у Балівіі, адзначаецца ў заяве нашага знешнепалітычнага ведамства.

## Прагноз па рэйтынгах Вялікабрытаніі пагоршаны да «негатыўнага»



Гэтае рашэнне эксперты агенцтва Moody's звязалі з паслабленнем брытанскіх інстытутаў, вымушаных спраўляцца з вялікай колькасцю палітычных выклікаў, якія з'явіліся ў апошні час. Яны таксама лічаць, што эканамічная і бюджэтная стабільнасць Вялікабрытаніі будзе аслабляцца ў далейшым і стане больш успрымальнай да шокаў, чым меркавалася раней. «Узрослая інертнасць і часам параліч, якія характарызуюць працэс прыняцця палітычных рашэнняў» у перыяд падрыхтоўкі да выхаду Вялікабрытаніі з Еўрасаюза, паказваюць, наколькі пагоршыліся «функцыянальнасць і прадказальнасць, якія заўсёды вылучалі інстытуцыйнае асяроддзе Вялікабрытаніі», пішуць аналітыкі. Brexit стаў каталізатарам пагаршэнняў, яны, як чакаюць у Moody's, захаваюцца на працягу пэўнага часу з улікам таго, што абмеркаванне ўмоў гандлёвага пагаднення Вялікабрытаніі і ЕС па-ранейшаму выклікае мноства спрэчак. Адным з найбольш важных момантаў з пункту гледжання крэдытных рэйтынгаў у Moody's лічаць той факт, што аслабляецца схільнасць Вялікабрытаніі да бюджэтнай дысцыпліны.

Энергазберажэнне

# Біяпаліва, электраабагрэў і эканомія газу



**Кожнае пяцігоддзе перад энергетыкамі ставіцца мэта сэканоміць не менш за 5 мільёнаў тон умоўнага паліва (т.у.п.). За больш чым 20 гадоў дзеяння праграмы энергазберажэння такім чынам сэканомлена энергія, якой хапіла б на абагрэў кватэр каля 2,5 мільёна чалавек.**

Згодна з Міжнародным энергетычным агенцтвам, энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту (ВУП) летась склала 160 кілаграмаў нафтавага эквіваленту на тысячу долараў. Гэта ўзровень Фінляндыі і Канады. Разам з тым энергаёмістасць еўрапейскіх краін, якія маюць падобныя да нашых кліматычныя ўмовы, на 30—50 % меншая за беларускую.

— З 1996 года па 2015-ы сумарна сэканомлена 24 мільёны т.у.п. Калі б не эканомія, то пры існуючых тэмпах росту ВУП энергаспажыванне ў краіне склала б 53—55 мільёнаў т.у.п. Цяпер жа мы трацім каля 36 мільёнаў, — заўважыў **Міхаіл МАЛАШАНКА, намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарта.** — Гэта дасягаецца за кошт укаранення новых энергаэфектыўных тэхналогій на прадпрыемствах, аптымізацыі схем цеплазабеспячэння і пераводу газавых кацельных на мясцовыя віды паліва (МВП): біяпаліва і торф.

У сістэме ЖКГ краіны 41 % цеплаэнергіі выпрацоўваецца з дапамогай біяпаліва і торфу. З 3800 камунальных кацельных на МВП пераведзена больш за 2700, а да 2021-га доля мясцовага паліва пры забеспячэнні будынкаў цяплом складзе ўжо, як мяркуецца, 52 %. Для гэтага ў краіне планамерна будуюцца энергакрыніцы на біяпаліве, а амаль палова ўсіх энергакрыніц (а не толькі тых, што знаходзяцца ў сістэме ЖКГ) пераведзена на МВП.

Толькі сёлета плануецца ўвесці ў работу энергакрыніцы на біяпаліве сумарнай цеплавой магутнасцю 106—109 МВт, а налета дадаць да гэтага паказчыка яшчэ 417 МВт.

Зніжэнне спажывання цеплаэнергіі ў шматкватэрных дамах — яшчэ адзін шлях эканоміі, бо 80 % жылля ў гэтым плане неэфектыўныя. На ацяпленне такім дамам патрабуецца ў двачы разы больш энергіі, чым сучасным энергаэфектыўным будынкам. З 63 мільёнаў Гкал цеплаэнергіі, якія расходуюцца ў цэлым па краіне, 23 мільёны патрабуе старое жыллё.

Спецыялісты спадзяюцца, што «ўцяпліць праблему» ўдасца з уступленнем у сілу **Указа Прэзідэнта № 327, які дазваляе праводзіць энергаэфектыўныя мерапрыемствы з дзяржпадтрымкай падчас капітальнага рамонту.** Цеплярэнавацыя сцен, замена вокнаў, уцяпленне дахаў, укараненне сістэм аўтаматычнага рэгулявання і індывідуальных прыбораў уліку цеплаэнергіі з тэхналогіяй аддаленага збору і ўліку інфармацыі — усё гэта пры жаданні жыхары аплацяць папалам з дзяржавай. Прычым бюджэт адразу ўсё, а жыхары сваю частку — штомесяц цягам дзесяці гадоў.

У Мінскай вобласці для эканоміі энергіі прадугледжана каля 130 мерапрыемстваў, якія дазволяць захаваць прыкладна 115 тысяч т.у.п., або 24,7 мільёна долараў, запэўніў **Дзмітрый КУЛАК, начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў.**

— Сёлета і ў 2020 годзе мяркуецца стварыць 16 крыніц на МВП магутнасцю 137 МВт, 24 МВт з якіх ужо ўведзена ў эксплуатацыю. Гэта дазволіць замясціць 34,4 мільёна м³ газу, — кажа ён.

Электраабагрэў, як мяркуецца, будзе ўкараняцца перш за ўсё ў раёнах новай забудовы шматкватэрных дамоў, дзе адсутнічаюць камунікацыі і інфраструктура (кацельныя і цеплатрасы).

— Пакуль мы плацім за ацяпленне на ўзроўні 20 % ад сабекошту, то больш выгадна атрымліваць энерганосьбіт ад цэнтралізаванага энергазабеспячэння, аднак мы набліжаемся да 100-працэнтнай аплаты за гэтыя паслугі. І замест 8 долараў за гігакалорыю будзем умоўна плаціць 40, — тлумачыць Міхаіл Малашанка. — Адпаведна будзе рэгулявацца тарыфная палітыка адносна энергіі, якая расходуецца на абагрэў і гарачае водазабеспячэнне. Для спажыўца ў выніку кошт павінен быць аднолькавы, каб не было кватэр і мікрараёнаў элітных, якія спажываюць энерганосьбіт па ніжэйшым кошце.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Надвор'е

# БАБІНА ЛЕТА. ЧАРГОВЫ ЗАХОД

## На гэтым тыдні прыгрэе не на жарт, месцамі да 17 цяпла

**Умовы надвор'я на тэрыторыі нашай краіны будзе ўасноўным вызначаць перыферыя антыцыклону, які раскінуўся над еўрапейскай часткай Расіі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У найбліжэйшы час таксама працягнецца паступленне цёплага паветра з поўдня Еўропы. Захаваецца цёплае надвор'е з тэмпературным фонам на 4—8 градусаў вышэй за кліматычную норму. А ў сераду ў нас будзе самае цёплае паветра на гэтым тыдні. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 па паўночным усходзе да плюс 10 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. Удзень будзе 9—15 цяпла, а па поўдні паветра прагрэецца да плюс 17 градусаў. У асобных раёнах па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, на астатняй тэрыторыі будзе большай часткай без ападкаў. Удзень месцамі чакаецца парывісты вецер.

У асноўным сонечна ў нас будзе і ў чацвер. У гэты дзень чакаецца надвор'е пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 градусаў па ўсходзе да 12 цяпла па захадзе краіны. Удзень будзе 6—13 цяпла, месцамі — да плюс 15 градусаў. З сярэдзіны месяца, у пятніцу, наша неба зноў пачне зацягваць шэрай заслонай. Пераважна па паўночназаходняй частцы краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 градуса па ўсходзе да 10 градусаў вышэй за нуль па захадзе краіны. Удзень будзе 5—12 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах — да плюс 14 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу і нядзелю ў асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля па ўсходзе да плюс 10 градусаў па захадзе краіны. Удзень будзе ад плюс 5 да плюс 12 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 13—15 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**


## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белая ромашка», 231792, г. Слоним, ул. Коссовский тракт, 100, Тел./факс 801562-6-30-29 |

**Предмет аукциона**

**Капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Столовая** (здание специализированное для общественного питания) | 672,7 кв. м | 450/С-18925 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,1316 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,1316 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 250 093,19 бел. руб.**

**Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д.13**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 2 | **Нежилое здание** (здание нежилое) | 415,5 кв. м | 450/С-24046 |
| | **Электрическая сеть** (сооружение специализированное энергетики) | 6,0 м | 450/С-23996 |
| | **Водопроводная сеть** (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 79,0 м | 450/С-23995 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,0457 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий по ул. Я. Купалы, 13

**Начальная цена с НДС 20 % – 38 774,56 бел. руб.**

**Условие аукциона:** вовлечь в хозяйственный оборот объект недвижимости с момента заключения договора купли-продажи, а в случае проведения реконструкции (строительство, сноса недвижимого имущества) – в сроки, определенные разработанной проектно-сметной документацией

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи** – 30 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 17.10.2019 г., по лоту № 2 в газете «Звязда» от 19.09.2019 г.

**Аукцион состоится 27.11.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.11.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.**

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**


Фінансы

# Золатавалютныя запасы краіны — ужо 9,2 мільярда долараў

**Міжнародныя рэзервовыя актывы нашай краіны на 1 лістапада, па папярэдніх звестак, склалі 9 млрд 193,8 млн долараў (у эквіваленце), паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

Прэс-служба Нацбанка ўдакладняе, што за кастрычнік золатавалютныя рэзервы выраслі на 362,9 млн долараў (на 4,1 %) пасля зніжэння ў верасні на 60,1 млн долараў (на 0,7 %). Акрамя таго, урад і Нацыянальны банк у кастрычніку выканалі знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў замежнай валюце на суму каля 225 млн долараў.

Павелічэнню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у кастрычніку спрыялі купля замежнай валюты Нацыянальным банкам на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты. Падтрыманню ўзроўню рэзерваў спрыяла накіраванне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, а таксама павелічэнне кошту манетарнага золата. Згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2019 год аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2020 года павінен складаць не менш за 7,1 млрд долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У МІНСКУ АДКРЫЎСЯ КАНСУЛЬТАЦЫЙНЫ ЦЭНТР ФСАН

**Нядаўна ў Мінску пачаў працаваць першы ў краіне кансультацыйны цэнтр Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Як паведамляе прэс-служба ведамства, цэнтр створаны з мэтай арганізацыі і правядзення на вышэйшым узроўні работы па аказанні паслуг у сферы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання юрыдычным асобам, індывідуальным прадпрымальнікам і грамадзянам краіны.

**У Цэнтры можна:**

— атрымаць кансультацыю па пытаннях дзяржаўнага сацыяльнага страхавання;

— навучыцца запаўненню і прадстаўленню справаздач і дакументаў персаніфікаванага ўліку, у тым ліку з выкарыстаннем праграмнага забеспячэння;

— атрымаць усе віды даведак з пераліку адміністрацыйных працэдур незалежна ад тэрытарыяльнай прыналежнасці плацельшчыка (грамадзяніна).

Для прыёму наведвальнікаў выкарыстоўваецца сістэма электроннай чаргі. Дапамогу па выбары адпаведнага спецыяліста можа аказаць адміністратар залы, які таксама адкажа на ўсе пытанні, што ўзнікнуць. На спецыяльным тэрмінале можна пакінуць свой водгук аб рабоце інспектара, ацаніўшы якасць аказаных паслуг.

Цэнтр размешчаны па адрасе: г. Мінск, вул. Талбухіна, 6. Тэлефоны для даведак і кансультацый: 8 (017) 3520282, 8 (017) 3520296, 8 (017) 3520748.

**Святлана БУСЬКО.**

# ЛАТВІЙСКАЯ І БЕЛАРУСКАЯ ЧЫГУНКІ БУДУЦЬ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ

## Каб падчас чэмпіянату свету па хакеі ў 2021 годзе забяспечыць балельшчыкам зручнае перамяшчэнне паміж сталіцамі дзвюх краін

**Далейшае супрацоўніцтва абмеркавалі старшыня праўлення Латвійскай чыгункі Марыс Клейнбергс і кіраўнік БЧ Уладзімір Марозаў.**

З улікам таго, што чэмпіянат пройдзе ў Рызе і Мінску, будзе распрацаваны спецыяльны расклад цягнікоў, якія курсіруюць паміж сталіцамі Латвіі і Беларусі. Работа над гэтым пытаннем будзе працягнута падчас падрыхтоўкі раскладу цягнікоў на 2020/2021 год. Бакі дамовіліся аб пашырэнні супрацоўніцтва для прыцягнення новых відаў грузаў і распрацоўкі новых лагістычных прапаноў, а таксама аб больш цесным супрацоўніцтве ў галіне маркетынгу, паведамляе рыжская газета Delfi.

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся таксама вынікі пасажырскіх перавозак сёлета: за дзевяць месяцаў на маршруце Мінск—Рыга перавезена 15 500 пасажыраў, што на 15,3 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Кіраўнікі латвійскай чыгункі і БЧ пагадзіліся, што неабходна працаваць над павелічэннем колькасці пасажыраў, у тым ліку зрабіўшы чыгуначныя зносіны паміж краінамі больш канкурэнтаздольнымі і зручнымі. Таксама гэтаму магло б спрыяць цяснейшае супрацоўніцтва з турыстычнымі кампаніямі, увядзенне камбінаваных білетаў на транспарт і скарачэнне часу паездкі на цягніку паміж Рыгай і Мінскам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ІСТОТНАЙ ІНФЛЯЦЫІ НЕ БУДЗЕ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

У заяве па выніках пасяджэння **старшыня праўлення Нацбанка Павел КАЛАУР** пазначыў фактары, якія паўплывалі на прынятае рашэння аб змяненні працэнтных ставак.

Паводле яго слоў, у III квартале гэтага года працягвала запавольвацца інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў. Дынаміка фактычнай гадавой інфляцыі, якая ў верасні склала 5,3 працэнта, фарміруецца ў адпаведнасці з прагнознымі ацэнкамі Нацыянальнага банка. Чакаецца, што ў канцы года і на працягу 2020 года інфляцыя будзе знаходзіцца ў межах пяці працэнтаў.

Прынятыя рашэнні забяспечваюць захаванне нейтральнага характару грашова-крэдытнай палітыкі. Азначанае зніжэнне ставак па крэдыце і дэпазіце авернайт забяспечыць звужэнне калідора працэнтных ставак па інструментах рэгулявання ліквіднасці банкаў да двух працэнтных пунктаў. У далейшым гэтыя стаўкі будуць змяняцца адначасова са стаўкай рэфінансавання на адпаведную велічыню.

## У гэтым годзе 5 %, і не вышэй

Кіраўнік Нацбанка адзначыў, што інфляцыя можа часова паскорыцца ў канцы года, але ўсё ж па яго выніках яна не перавысіць 5 %.

У кастрычніку бягучага года тэмп змены спажывецкіх цэн у гадавым выражэнні можа сфармавацца крыху вышэй за вераснёўскі ўзровень з-за кошту пладова-агароднай прадукцыі, адзначыў Павел Калаур. І сапраўды, летась цэны на сельгаспрадукты былі анамальна нізкія (так ужо атрымалася), таму «спаборнічаць» з імі ў гэтым годзе атрымліваецца праблематычна.

У той жа час тэндэнцыя запавольлення манетарнай інфляцыі, якая назіраецца на працягу двух кварталаў, працягнецца. Нацбанк чакае, што да канца 2019 года інфляцыя будзе складаць каля 5 %.

Пры прыняцці рашэння аб узроўнях працэнтных ставак Нацбанк глядзеў не толькі на бягучы год, але і на наступны. «Наша мэта па інфляцыі на 2020 год — не вышэй за 5 %. Мы ацэньвалі ўплыў усіх фактараў на гарызонце да канца 2020 года. Агульны вынік — у прагназуемых намі ўмовах і з улікам прынятага рашэння па стаўках прырост спажывецкіх цэн па выніках наступнага года не перавысіць 5 %», — сказаў Павел Калаур.

## Ці вытрымае стаўка?

Нацыянальны банк не чакае праінфляцыйнага ціску з боку ўнутраных фактараў. Менавіта так пракаментаваў старшыня праўлення Нацбанка прынятае рашэнне аб зніжэнні памеру стаўкі рэфінансавання з 20 лістапада да 9 % гадавых.

Паводле яго слоў, адсутнасць праінфляцыйных фактараў абавязана прагназуемаму захаванню ў сярэднетэрміновай перспектыве эканамічнай актыўнасці. Рост эканомікі будзе характарызавацца збалансаванай дынамікай унутранага попыту і знешняга гандлю.

«Бюджэтная палітыка не будзе выступаць крыніцай паскарэння інфляцыйных працэсаў, нягледзячы на чаканы дэфіцыт бюджэту ў наступным годзе. Назапашаныя рэшткі бюджэтных сродкаў будуць выкарыстоўвацца пераважна для пагашэння знешняга дзяржаўнага доўгу», — паведаміў Павел Калаур.

Ён дадаў, што Нацбанк аддае вялікую ўвагу ацэнцы рызык, звязаных з дынамікай заработнай платы. Яе гадавы рост нязначна паскорыўся ў III квартале бягучага года. Адначасова назіралася ўзмацненне ашчадных працэсаў у эканоміцы. «Чакаецца, што ў сярэднетэрміновым перыядзе дынаміка заработнай платы будзе вызначацца прадукцыйнасцю працы».

Кіраўнік Нацбанка згадаў, што ўзрослая ў бягучым годзе чыстая прапанова валюты на ўнутраным рынку абумовіла намінальнае павелічэнне эфектыўнага курсу беларускага рубля, што таксама абмяжоўвала павышэнне цэн.

«У сярэднетэрміновым перыядзе чакаецца захаванне дэзынфляцыйнага ўплыву з боку курса беларускага рубля, разам з тым паступова гэты ўплыў будзе слабець», — паведаміў Павел Калаур. Ён падкрэсліў, што будучая дынаміка інфляцыйных працэсаў шмат у чым будзе залежаць ад велічыні і кірунку змены інфляцыйных чаканняў.

Сёння такія чаканні досыць адчувальныя да эканамічных шокаў. Моцнае павелічэнне рэгуляваных дзяржавай тарыфаў і залішняя валацільнасць цэн на пладова-агародннюю прадукцыю аказваюць значны ўплыў на інфляцыйныя чаканні. У сваю чаргу, павышаны ўзровень інфляцыйных чаканняў — гэта фактар рызыкі для цэнавай стабільнасці, паколькі ён з часам трансфармуецца ў фактычны рост цэн. «У той жа час чакаецца паступовае змяненне гэтай сітуацыі ў сярэднетэрміновай перспектыве, у тым ліку па меры таго, як інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў стабілізуецца».

## Хай рост невялікі, але затое рэалістычны

Растлумачылі на брыфінгу і меркаванне Нацбанка з нагоды прагнозу па росце нацыянальнай эканомікі ў 2020 годзе. «Калі вам важны адказ Нацбанка (паводле прагнозу росту эканомікі), то я вам скажу, што базавы, кансерватыўны варыянт, падрыхтаваны для бюджэту, — цалкам рэалістычны. Я не падвяргаў бы яго сумневам з пункту гледжання эканамічнага росту. Гэта 1,9 % (рост ВУП у наступным годзе)», — сказаў Павел Калаур.

У той жа час **намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей КАЛЕЧЫЦ**, каментуючы чаканы рост эканомікі, адзначыў, што «ніжняя мяжа (росту эканомікі) — гэта патэнцыйны рост, які адпавядае, як гэта неаднаразова гаварылася, таму, што ёсць на сённяшні дзень (рост ВУП за 9 месяцаў — 1 %)». «Усё, што вышэй — гэта як спрацуем», — дадаў ён.

Каментуючы перспектывы наступнага года, Калечыц таксама паведаміў, што чакаецца рост крэдытнага партфеля банкаў, у першую чаргу, у беларускіх рублях. «Тое, якімі тэмпамі гэта адбываецца, нас задавальняе. Наступны год не будзе выключэннем, рублёвы крэдытны партфель будзе расці хутчэй, чым валютны. Адпаведна, будзе і далей паляпшацца яго структура», — сказаў ён.

У сваю чаргу начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацбанка Дзмітрый Мурын адзначыў, што прырост крэдытнага партфеля беларускіх банкаў у наступным годзе складзецца на ўзроўні прагназуемага росту шырокай грашовай масы — у межах 8-11 %. Тэмпы крэдытавання ў прынцыпе блізкія да прагнозу росту грашовай масы. Мяркуецца, што рублёвае крэдытаванне ў наступным годзе будзе расці хутчэй — каля 12-14 %.

## Доўгатэрміновы прагноз інфляцыі — 4 %

Дастаткова смелы прагноз зрабілі эксперты Нацбанка на доўгатэрміновую перспектыву. «Мы цалкам дапускаем, што на наступную пяцігодку ў якасці мэты па інфляцыі вызначым паказчык 4 %», — адзначыў Павел Калаур.

Паводле яго слоў, гэтае пытанне яшчэ будзе абмяркоўвацца з урадам з улікам розных структурных праблем, у першую чаргу звязаных з ліквідацыяй перакрыжаванага субсідавання. Старшыня праўлення Нацбанка звярнуў увагу, што пры ўсталяванні мэты па інфляцыі на ўзроўні 4 % могуць быць адхіленні ад планаванага паказчыка, аднак сітуацыю будуць рэгуляваць з дапамогай розных інструментаў. «Калі раптам будуць разавыя шокі і яны прывядуць да адхілення ад паказчыка 4 %, — інфляцыя будзе ўмоўна 6 %, то праз інструменты манетарнай і ў цэлым агульнаэканамічнай палітыкі Нацбанк і ўрад будуць вяртацца да мэтавага паказчыка, каб ён выконваўся», — дадаў Павел Калаур.

## На ўнутраным рынку не павінна быць валютных пазык

Старшыня праўлення Нацбанка заявіў аб сваёй прынцыповай пазіцыі адмовіцца ад валютных пазык на ўнутраным рынку. «Не хацелася б дзеля забеспячэння рэзерваў любой цаной — выгадна або нявыгадна — ажыццяўляць тыя ці іншыя запазычанні. Для мяне, як старшыні Нацыянальнага банка, прынцыпова важна, каб наш банк наогул не запазычаў на ўнутраным рынку ў замежнай валюце», — заявіў Павел Калаур.

Ён адрасаваў аналагічнае пажаданне Мінфіну, які сёлета размясціў на ўнутраным рынку дзяржаблігацыі ў замежнай валюце на 800 млн долараў. «І Міністэрства фінансаў каб таксама максімальна скарачала свае запазычанні на ўнутраным валютным рынку, зводзячы іх да нуля», — працягнуў кіраўнік Нацбанка. Паводле яго слоў, «вырашаючы тыя ці іншыя задачы, заўсёды можна знаходзіць кампрамісы, якія дазволяць не пагаршаць сітуацыю ў цэлым у эканоміцы».

— Мы разам з урадам заклалі вельмі гнуткі падыход і не ставім перад сабой нерэалізуемых планаў, — сказаў кіраўнік Нацбанка. — Па факце мы будзем выбудоўваць сваю палітыку такім чынам, каб за кошт працэсаў, адзін з якіх — дэвалютызацыя, мы мелі магчымасць захоўваць і нарошчваць свае рэзервы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

На вышыні

# Брэндавыя тарыфы, новыя самалёты і палётная картка

Як жыве і развіваецца айчынны паветраны флот

**Хутка ў краіне можа быць створана нацыянальная школа пілотаў. Пра гэта расказаў дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём СІКОРСКІ.**

— У свеце назіраецца дэфіцыт лётных кадраў, ён ёсць і ў Беларусі, таму вырашэнне гэтай праблемы для нас будзе ў прыярытэце. Раней у краіне камерцыйных пілотаў не рыхтавалі, іх навучанне праходзіла ў Расіі, Украіне, краінах Балтыі. Цяпер мы збіраем неабходныя дакументы на імя кіраўніка дзяржавы, каб ён падтрымаў падыходы, распрацаваныя Дэпартаментам па авіяцыі, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй авіяцыі, авіяцыйнымі арганізацыямі.

У краіне ідзе работа над прапановамі па з'яўленні лаўкост-тарыфаў (зніжаных цэн) на пералёты. Пакуль дасягнута пагадненне толькі з венгерскай авіякампаніяй Wizzair: вясной 2020 года стартуюць рэйсы з Мінска ў Будапешт. З'яўленне лаўкост-маршрутаў плануецца за кошт авіякампаніі «Белавія».

— У яе ўжо ёсць такія ў аэрапорт Жукоўскі ў Маскве, але маршрутная сетка можа быць пашырана. Каб мадэль пачала працаваць, неабходна прыняць рашэнне на ўзроўні ўрада. Запусціць лаўкост сіламі «Белавія» найбольш аптымальна і правільна — трэба падтрымліваць нацыянальнага перавозчыка, ствараць умовы, пры якіх ён зможа працаваць па любых напрамках, у тым ліку з абласных аэрапортаў, — сказаў Арцём Сікорскі.

«Белавія» — найбуйнейшы авіяперавозчык Беларусі. Ён ажыццяўляе рэгулярныя рэйсы ў 55 аэрапортаў 29 краін Еўропы і Азіі. Флот кампаніі налічвае 30 паветраных суднаў. Па словах **генеральнага дырэктара Анатоля ГУСАРАВА**, да летняга сезона авіякампанія папоўніць парк сямю Boeing


Фота БелТА.

737 MAX. А ў снежні і красавіку наступнага года — двума Embraier.

Ідзе работа і над пашырэннем маршрутнай сеткі. Сёлета былі адкрыты рэгулярныя рэйсы ў Мюнхен і Талін, летась — у Албанію. Налета авіякампанія разлічвае адкрыць дадатковыя маршруты ў Казахстан, Іспанію і на Кіпр.

— Канчатковае рашэнне па гэтых напрамках яшчэ не прынятае, але мы спадзяёмся атрымаць дазвол на палёты ў Актау, бо там ёсць транзіт з Еўропы. Што датычыцца Іспаніі, плануем адкрыць маршрут да курортнага горада Рэус. Таксама ў 2020 годзе будуць пашыраны чартарныя праграмы, — паведаміў Анатоль Гусараў.

Кіраўнік «Белавія» падкрэсліў, што бізнес-мадэль поўнага сэрвісу кампаніі ўжо не актуальная, ёй на замену прыйшла сучасная гібрыдная. Гэта было зроблена для аптымізацыі кошту білетаў.

— «Белавія» завяршае распрацоўку і хутка плануе ўкараніць сістэму брэндавых тарыфаў. Яны будуць падзеленыя на групы. Калі пасажыр ляціць без багажу, яго тарыф будзе мінімальны. Калі з чамаданам — іншы. Такі фармат палёту дасць магчымасць пасажырам самім выбіраць кошт білету. У залежнасці ад таго, колькі іх будзе прададзена, сістэма можа аўтаматычна закрыць танныя класы. Тыя, хто прыйдзе пазней, будуць ляцець ужо па вышэйшай цане, — расказаў Анатоль Гусараў.

Каб зрабіць знаходжанне пасажыраў у зоне рэгістрацыі больш камфортным і хуткім, за апошні час у Нацыянальным аэрапорце ўкаранілі некаторыя наваўвядзенні. Пра іх паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці Васіль КОРНЕЎ.**

— У маі мы пачалі эксплуатаваць другую ўзлётна-пасадачную паласу. Гэта дазволіла прымаць усе віды паветраных суднаў пры любых умовах надвор'я. Сёлета з'явіліся новыя віды сэрвісу для пасажыраў: арганізаваныя сістэма аўтаматычнага афармлення багажу drop-off, паскоранае праходжанне палётных працэдур fast track, калі пасля рэгістрацыі можна падысці да аўтамата, які дазваляе прыняць гэтую паслугу, і прайсці яе па-за чаргой праз пункт кантролю. Працуе сістэма ProVision, якая хутка скануе пасажыраў на наяўнасць небяспечных прадметаў, а таксама функцыя электроннага пасадачнага талона — яго можна набыць толькі пры анлайн-рэгістрацыі, — паведаміў выступоўца. — Акрамя таго, падчас рэгістрацыі ўжо няма неабходнасці здымаць абутак, бо ёсць спецыяльныя сканеры. Дзякуючы гэтаму мы павялічылі хуткасць агляду пасажыраў на 33 працэнты.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# КУДЫ ЦЯКУЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ

## і ці быць беларускаму салу?



**Рэспубліка Беларусь уваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых сусветных экспарцёраў асноўных відаў малочнай прадукцыі, прычым па масле займае трэці радок сусветнага рэйтынга, па сырах і тварагу — чацвёрты, сухім абястлушчаным малаку — пяты. Запатрабавана за мяжой і беларускае мяса, па экспарце ялавічыны мы сёмыя ў свеце, па мясе птушкі — дзявятыя.**

— У студзені — жніўні 2019 года мяса-малочная прадукцыя склала 59,6 працэнта экспарту, і ў параўнанні з адпаведным перыядам 2018 года яе доля павысілася на 1,7 працэнтнага пункта. Валютная выручка ад экспарту мяса-малочнай прадукцыі — 2,085 мільярда долараў (106,2 % у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года). Планамернае нарошчванне фізічных аб'ёмаў экспарту малочнай прадукцыі дасягнута дзякуючы рэалізацыі рэспубліканскіх і галіновых праграм, падчас якіх праведзена мадэрнізацыя і тэхнічнае пераабсталяванне малака- і мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў краіны, — паведаміў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Іван ЦАРЫК.**

Традыцыйна асноўнымі рынкамі для беларускіх вытворцаў з'яўляюцца краіны СНД. У студзені — жніўні 2019 года сюды было завезена малака і малакапрадуктаў на суму амаль 1,5 мільярда долараў, мяса і мясапрадуктаў — на 555,3 мільёна.

Наогул, сёння беларуская малочная прадукцыя трапляе ў 51 краіну свету (сёлета было асвоена дзесяць новых рынкаў). Нашы прадукты прыйшліся даспадобы спажыўцам з Еўропы, Амерыкі, Афрыкі. Праўда, доля экспарту малочных прадуктаў у краіны па-за межамі СНД за студзень — жнівень 2019 года ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам знізілася на 1,8 працэнта. Найбольшы аб'ём беларускіх малочных прадуктаў пастаўляецца ў краіны Азіі (пераважна ў Кітай). Сёлета арганізацыі нашай краіны пачалі прадаваць «малочку» і ў Афганістан, Інданезію, Малайзію, Катар, Тайланд, Тайвань.

У Злучаныя Штаты Амерыкі завозяцца беларускія сыры, тварог, масла, канцэнтраванае, сгушчанае малако, марожанае.

Беларускае мяса і прадукты з яго сёлета былі запатрабаваны ў 19 краінах свету (пры гэтым асвоена пяць новых рынкаў). За восем месяцаў у краіны не СНД пастаўлена мясной прадукцыі на суму 24,4 мільёна долараў, што ў пяць разоў перавысіла аб'ёмы экпарту ў адпаведны перыяд 2018 года. І зноў жа, пераважна прадукцыя ідзе ў азіяцкія краіны, пры гэтым 93,2 % у экспарце мяса і мясапрадуктаў прыпадае на Кітай.

### ХОПІЦЬ УСІМ!

Сёння мала проста вырашаць пытанні па забеспячэнні разнастайнымі прадуктамі насельніцтва краіны. Прымаюцца меры для павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай галіны і развіцця экспартаарыентаванага кірунку.

Натуральна, нам не патрэбна такая колькасць малака і мяса, што сёння выробляецца ў Беларусі — 60 працэнтаў малочнай і 28 мясной прадукцыі ідзе на экспарт. Як заўважыў Іван Царык, у краіне робіцца вельмі многа, каб надалей нарошчваць аб'ёмы і скараць дадатковыя рынкі. Плануецца выйсці на вытворчасць больш чым дзевяць мільёнаў тон малака ў год (сёлета мы дасягнём лічбы ў 7,1 мільёна). Наладжана селекцыйна-племянная работа, налета вучоныя павінны прадставіць новую пароду Белгалшцін, генетычны патэнцыял якой 10-11 тысяч кг малака ад каровы на год. Гэтыя жывёлы найбольш адаптаваныя пад нашы ўмовы.

Паступова закрываюцца старыя фермы, адкрываюцца новыя. Цяпер 43 працэнты фермаў працуюць па сучасных тэхналогіях, і на іх выробляецца 65 працэнтаў усяго малака. Такія захады дазваляюць зніжаць выдаткі на вытворчасць і павышаць якасць прадукцыі. Плануецца таксама пераходзіць на вырошчванне бялку ўласнай вытворчасці, што зноў жа паспрыяе патаненню прадукцыі.

### ЦАНА ЦІ ЯКАСЦЬ?

А вось сальная свініна ў Беларусь завозіцца з Расіі, і гэта пры тым, што традыцыйныя беларускія пароды і іх помесі былі сальнага і мяса-сальнага кірунку. Рэч у тым, што вытворчасць сала ў тры разы даражэйшая за мяса. Да таго ж, хто можа даць гарантыю вытворцам, што, калі яны возьмуцца за падобную справу, прадукцыя знойдзе пакупніка? Цяпер селекцыя арыентуецца больш на мясную прадукцыю, бо на яе ёсць попыт. Канешне, сальная свініна неабходная для вытворчасці каўбасы накшталт любімай многімі «пальцам пханай», але гэта тавар прэміум-класа і не ўсе гатовы яго набыць. Магчыма, у будучым попыт на традыцыйныя беларускія пароды вырасце, таму што спатрэбіцца больш каларыйная ежа для паўночных рэгіёнаў Расіі, дзе зараз актыўна вядзецца распрацоўка карысных выкапняў. А як пракарміць галодных нафцянікаў, геолагаў, ваенных? Паспрабуйце знайсці лепшую альтэрнатыву салу.

Ёсць будучыня і ў іншых беларускіх прадуктаў. Іван Царык падкрэсліў, што сёння пакупнікі больш увагі звяртаюць на цэны, а не на якасць. Мала хто задумаецца, што, калі набываць танныя прадукты з вялікай колькасцю розных дабавак, пасля давядзецца раскашэльвацца на лекі. Ён упэўнены: трэба выхоўваць пакупніка, гаварыць пра якасць беларускіх прадуктаў, напрыклад, пра тое, што наша мяса больш карыснае, чым імпартнае.



### БУДУЧЫНЯ ЗА БІЯТЭХНАЛОГІЯМІ

Адна з асноўных задач, якая стаіць сёння — максімальнае выкарыстанне патэнцыялу прадукцыйнасці жывёлы. Над вырашэннем яе шчыруюць беларускія вучоныя. Дзякуючы іх распрацоўкам удасканальваецца структура кормавытворчасці, у рацыён жывёлы ўводзяцца новыя біялагічна актыўныя дабаўкі. Можна згадаць і пра распрацоўку новых праектных рашэнняў для жывёлагадоўчых комплексаў. Як паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара па навуцы Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі Аляксандр БУДЗЕВІЧ,** вучоныя праводзяць даследаванні, накіраваныя на вывучэнне новых генаў, звязаных з прадукцыйнасцю жывёлы, ідзе распрацоўка праграмнага забеспячэння для прагназавання племянной каштоўнасці жывёлы, вывучаюцца і ўдасканальваюцца тэхналагічныя прыёмы стварэння найбольш прымальных умоў для яе ўтрымання. Працягваюць развівацца і выкарыстоўвацца біятэхналагічныя метады ўзнаўлення статка ў краіне. І ўжо сёння можна смела заяўляць, што будучыня жывёлагадоўлі — за ДНК-тэхналогіямі.

— Мы падышлі ўжо да таго моманту, калі можам выкарыстоўваць клетачныя тэхналогіі для атрымання большай колькасці эмбрыёнаў і, як вынік, матэрыялу для племзаводаў краіны, — падзяліўся Аляксандр Будзевіч. — Збіраемся адпрацоўваць пытанні кансервавання біяматэрыялу сельскагаспадарчых жывёл, кланіравання, будзем удасканальваць кармавыя дабаўкі на аснове нанатэхналогій (з выкарыстаннем иначасціц), выкарыстоўваць не толькі методыкі класічнай селекцыі, але і геномнай ацэнкі, вывучаць прадукцыйныя якасці з дапамогай ДНК-метадаў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота БелТА.**

# Лепш адзін раз пакаштаваць...

**Юбілейная выстаўка і дзелавы форум «Харчовая прамысловасць Рэспублікі Беларусь ва ўмовах паглыблення інтэграцыйных працэсаў» пройдзе ў Мінску 12—15 лістапада.**

Запланавана, што гэтае мерапрыемства збярэ больш за 150 вытворцаў з Сінявокай і замежных краін. Пра гэта паведаміў **намеснік дырэктара Выставачнага цэнтра «БелЭкспа» Яўген БРЫГАДНЫ.**

Тут будуць прадстаўлены найлепшыя харчовыя прадукты і напоі на беларускім рынку. Юбілейнае мерапрыемства адбудзецца пры падтрымцы ўрада і збярэ ўсіх буйных удзельнікаў харчовага бізнесу, прадстаўнікоў навукі, галіновых міністэрстваў і бізнес-саюзаў.

**Старшыня Рэспубліканскага саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Аляксандр ШВЕЦ** разнапланава растлумачыў мэты і задачы будучага дзелавога форуму.

На яго погляд, «асноўныя выклікі нацыянальнай эканоміцы фарміруюць умовы, якія мы атрымаем у выніку інтэграцыйных працэсаў ЕАЭС і СГА. З якімі прадуктамі мы сёння ідзём у Расію, Заходнюю Еўропу і краіны далёкай дугі і з чым павінны ісці заўтра? Гэта будзе адкрытая размова з калегамі, партнёрамі, кіраўніцтвам, Белдзяржхарчпрамам і Белкаапсаюзам. Мы хацелі б пачуць кароткія даклады аб найлепшых дзелавых практыках пабудовы бізнес-мадэляў».

Па словах Аляксандра Швеца, вялікае маркетынгавае дасягненне ўсёй нашай харчовай галіны — пазітыўны «сарафанны маркетынг». У якую краіну былога СССР ні паедзеш, «усюды людзі кажуць, што ў вас каўбаса, як пры Савецкім Саюзе, і нават лепшая. Але трэба ісці далей і прапаноўваць інавацыйныя прадукты».

Пра свой удзел у выстаўцы ўжо заявілі 200 найбуйнейшых вытворцаў і гандлёвых прадстаўнікоў Беларусі, краін СНД і Еўрапейскага саюза. Менавіта да «ПрадЭкспа» многія з іх імкнуцца прымеркаваць запуск новых прадуктаў і гандлёвых марак.

На парадку дня ўдзельнікаў дзелавога форуму заяўленыя такія тэмы для абмеркавання, як пошук умоў для павышэння эфектыўнасці работы беларускіх птушкагадоўчых прадпрыемстваў, развіццё вытворчасці арганічнай прадукцыі, а таксама магчымыя экалагічныя змены на рынку ўпакоўкі. На пленарных пасяджэннях плануецца абмяркоўваць развіццё фермерства, вузкіх спецыялізацый, такіх як авечкагадоўля, і, безумоўна, хіт аграрнай палітыкі — развіццё арганічнай сельскай гаспадаркі.

Сімвалічна, што 18 лістапада ў краіне ўступае ў сілу закон аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі. Па словах **намесніка начальніка Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча Таццяны КАРБАНОВІЧ,** пакуль у Беларусі толькі 27 суб'ектаў гаспадарання займаюцца арганічнай прадукцыяй, сертыфікавана 1600 гектараў зямлі, ёсць акрэдытаваныя лабараторыі, гатовыя выдаваць сертыфікаты для паставак у Еўрасаюз.

Тэма сёння больш цікавая вытворцам і гандлёвым сеткам, якім важна, каб на паліцах прысутнічала такая прадукцыя. Дзякуючы новым заканадаўчым рамкам вытворчасці і продажу павінны сысці ў нябыт фальшывыя «натуральныя» тавары. Адметны знак атрымаюць тыя, якія сапраўды зроблены па стандарце і адпавядаюць усім патрабаванням.

Прымуць удзел у выстаўцы і вядучыя беларускія вытворцы. Па словах **галоўнага спецыяліста аддзела каардынацыі пастаўкі тавараў канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Святланы БАРАДЗІНОЙ,** толькі іх канцэрн выставіць восем стэндаў, дзе будзе прадстаўлена алкагольная, кандытарская, цукровая, солевая і іншыя віды прадукцыі.

Сярод цэнтральных падзей выставачнага форуму — Міжнародны сімпозіум хлебапёкаў, на які з'едзецца каля 200 прадстаўнікоў хлебапякарнай галіны з Беларусі, Германіі, Італіі, Літвы, Нідэрландаў, Расіі і іншых краін. Тут будуць прадстаўлены апошнія навінкі абсталявання і тэхналогій у сферы хлебапячэння і кандытарскай вытворчасці, а спецыялісты змогуць абмеркаваць актуальныя пытанні развіцця і вынікі сусветных даследаванняў спажывецкіх пераваг у хлебабулачных вырабах.

Самым відовішчным мерапрыемствам юбілейнага «ПрадЭкспа-2019» стане гастранамічны праект — міжнародны кулінарны кубак (INTERNATIONAL CULINARY CUP). З 12 да 14 лістапада на выставачных пляцоўках разгорнуцца практычныя спаборніцтвы прафесійных кухараў, кандытараў і зборных камандаў з краін блізкага і далёкага замежжа. Прыняць удзел у конкурсе, пазмагацца за званне найлепшага і атрымаць прыз «брыльянтавы каўпак» можа любы ахвотны. Будуць арганізаваны шматлікія майстар-класы вядучых шэф-повараў і кандытараў.

Упершыню ў рамках выстаўкі пройдуць бліц-перагаворы закупшчыкаў беларускіх і расійскіх гандлёвых сетак з вытворцамі і пастаўшчыкамі прадуктаў харчавання і напояў. Гэта дапаможа кампаніям знаходзіць першасны кантакт для развіцця далейшых узаемаадносін.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Несвижское райпо, Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Советская, 5/1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Имущество (складская база), расположенное по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея, ул. Вокзальная, 2А.**
**Реализуется одним лотом в следующем составе:**

| Наименование (назначение) | Общ. площадь | Инвентарный № |
|---|---|---|
| **Здание проходной** (здание неустановленного назначения).<br>Составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание проходной 1А1/к | 12,5 кв. м | 621/С-1027507 |
| **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ).<br>Составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание склада А1/к с навесом № 1 | 501,8 кв. м | 621/С-1027508 |
| **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ).<br>Составные части и принадлежности: целое одноэтажное бревенчатое здание склада А1/д с подвалом (А1/д), двумя входами в подвал № 1, № 2, навесом № 3 | 981,1 кв. м | 621/С-1027512 |
| **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ).<br>Составные части и принадлежности: целое одноэтажное металлическое здание склада 3А1/м | 190,5 кв. м | 621/С-1027513 |
| **Здание бытовое** (здание неустановленного назначения).<br>Составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание бытовое 2А1/к с пристройкой № 1 | 31,5 кв. м | 621/С-1027510 |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве аренды для обслуживания здания бытового, здания проходной и зданий складов, общ. пл. 0,4317 га, сроком до 23.02.2065

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 165 854,50 бел. руб.**

**Доп. информация:** здания складов с инв. № 621/С-1027512 и с инв. № 621/С-1027508 находятся в частичной аренде. Более подробная информация – на сайте ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Страшко Дарья Александровна, контактный тел. +375 (44) 572-81-93

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также оплатить установленное вознаграждение Организатору торгов в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 12.09.2019

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 25.11.2019** в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 22.11.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Республиканского унитарного предприятия «Минскавтодор-Центр» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **изолированного помещения конторы *(линейной дорожной дистанции № 662 филиала «ДЭУ № 66»)* с инвентарным номером 633/D-5080 общей площадью 55,9 кв. м, расположенного в здании блокированного жилого дома с инвентарным номером 633/С-6694 по адресу: Минская область, Мядельский район, г. п. Свирь, ул. Советская,14-4 (далее – Объект).**

**Начальная цена без НДС – 11 000,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **1 100,00** бел. руб.

**Задаток перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **17.12.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.12.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНП 190638747

## РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 12.12.2019 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым номером 623883000043000051 площадью 0,102 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Олехновичский с/с, СТ «Ветеран-7», У-68. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 5 500,00 бел. руб., задаток – 550,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 343/С-36804, общей площадью 1059,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. К. Маркса, 39/10. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад материально-технических ценностей. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 325450100001000075 площадью 5,1682 га. **Начальная цена продажи – 160 596,00 бел. руб., задаток – 16 059,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-150655, общей площадью 12,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Хатежинский с/с, аг. Хатежино, ул. Центральная, 18Б, корп. 5.
Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: здание КПП. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623687500001000154 площадью 3,9966 га. **Начальная цена продажи – 7 128,00 бел. руб., задаток — 712,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Незавершенное законсервированное капитальное строение (готовностью 11 %) с инвентарным номером 600/U-145206, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Капличи, 42А. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623681308601000020 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 56 592,00 бел. руб., задаток – 5 659,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-10840, общей площадью 2091,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, 99Б. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001032051 площадью 0,2254 га. **Начальная цена продажи – 845 100,00 бел. руб., задаток – 84 510,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Земельный участок с кадастровым номером 623684011601000084 площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Минская обл., Минский р-н, Лошанский с/с, д. Слобода, 44. Назначение: земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома. **Начальная цена продажи – 18 684,00 бел. руб., задаток – 1 868,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Земельный участок с кадастровым номером 623684300601000100 площадью 0,1235 га с расположенным на нем незавершенным незаконсервированным капитальным строением, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево. Целевое назначение: строительство и обслуживание жилого дома. **Начальная цена продажи – 89 424,00 бел. руб., задаток – 8 942,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 311/С-50643, общей площадью 138,3 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Добруш, ул. Московская, 18А. Назначение: здание специализированное розничной торговли, наименование: торговый павильон. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321250100002000636 площадью 0,0375 га. **Начальная цена продажи – 61 740,00 бел. руб., задаток – 6 174,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Единый объект недвижимого имущества в составе земельного участка, кадастровый номер 623685700009000130, площадью 0,0892 га, и садового домика, инвентарный номер 600/С-130448, общая площадь 40,7 кв. м, расположенные по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, сад. тов-во «Лукоморье», 402. **Начальная цена продажи – 13 050,00 бел. руб., задаток – 1 305,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-79858, общей площадью 2940,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Гоздецкого, 12/5. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов, наименование: цех элементов несъемной опалубки. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029161 площадью 0,5028 га. **Начальная цена продажи – 1 026 258,39 бел. руб., задаток – 102 625,84 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-79856, общей площадью 585,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Гоздецкого, 12/3. Назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование: навес. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029162 площадью 0,1014 га. **Начальная цена продажи – 157 680,00 бел. руб., задаток – 15 768,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-79860, общей площадью 906,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Гоздецкого, 12/18. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов, наименование: цех металлоконструкций № 2. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029163 площадью 0,1232 га. **Начальная цена продажи – 299 160,00 бел. руб., задаток – 29 916,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50485, общей площадью 676,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Правды, 25. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: контора. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000124 площадью 0,8815 га. **Начальная цена продажи – 741 600,00 бел. руб., задаток – 74 160,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-59308, общей площадью 419,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Городиловский с/с, д. Городилово. Назначение: здание специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения, наименование: одноэтажное кирпичное здание Городиловского сельского клуба. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623880803601000066 площадью 0,1100 га. **Начальная цена продажи – 3 672,00 бел. руб., задаток – 367,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708016896, общей площадью 14,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 3, пом. 188. Назначение: машино-место, наименование: машино-место № 188. **Начальная цена продажи – 18 900,00 бел. руб., задаток – 1 890,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708016883, общей площадью 14,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 3, пом. 166. Назначение: машино-место, наименование: машино-место № 166. **Начальная цена продажи – 18 900,00 бел. руб., задаток – 1 890,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 17.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708016874, общей площадью 14,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 3, пом. 156. Назначение: машино-место, наименование: машино-место № 156. **Начальная цена продажи – 18 900,00 бел. руб., задаток – 1 890,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 18.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708016878, общей площадью 14,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 3, пом. 161. Назначение: машино-место, наименование: машино-место № 161. **Начальная цена продажи – 18 900,00 бел. руб., задаток – 1 890,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 19.** Капитальное строение с инвентарным номером 641/С-11368, общей площадью 557,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Клецк, ул. Кирова, 1. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад-ангар металлический. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622550100002002365 площадью 5,1499 га. **Начальная цена продажи – 43 200,00 бел. руб., задаток – 4 320,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 20.** Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-11461, общей площадью 11,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрь, ул. Колхозная, 54. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625083009101000170 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 2 700,00 бел. руб., задаток – 270,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 21.** Земельный участок с кадастровым номером 623280810601000030 площадью 0,2394 га, расположенный по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, д. Родевичи, уч. № 4. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома. **Начальная цена продажи – 7 884,00 бел. руб., задаток – 788,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 22.** Земельный участок с кадастровым номером 623280810601000027 площадью 0,2431 га, расположенный по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, д. Родевичи, уч. № 3. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома. **Начальная цена продажи – 7 992,00 бел. руб., задаток – 799,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ.
Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость»

**Аукцион состоится 12.12.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Заявления на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн.– чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений – 09.12.2019 в 12.00.
Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 12 декабря 2019 года.
**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию департамента в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия «Белоруснефть-Транс» (продавец имущества) извещает о проведении 25 ноября 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Местонахождение имущества:** (лот №№ 1–5) г. Мозырь – 11 промзона Михалки, (лот № 6) г. Гомель, ул. Проселочная, 16а. **Примечание:** имущество реализуется без учета НДС 20 % (в соответствии с п. п. 2.3 ст. 93 НК РБ, при условии выполнения п. 6.11. Указа РБ № 294 от 04.07.2012 г.) | | | |
| 1 | **Грузовой седельный тягач MAZ 544019** (рег. знак № АМ 3528-3), инвентарный номер № 2054 (по бух. учету), год выпуска – 2009, цвет – зеленый | **14 401,39** | 1 440,14 |
| 2 | **Грузовой седельный тягач MAZ 544069** (рег. знак № АМ 3034-3), инвентарный номер № 5073Б (по бух. учету), год выпуска – 2007, цвет – белый | **26 298,82** | 2 629,88 |
| 3 | **Грузовой седельный тягач MAZ 5440B9-420-031** (рег. знак № АМ 1046-3), инвентарный номер № 31460 (по бух. учету), год выпуска – 2011, цвет – зеленый | **17 380,41** | 1 738,04 |
| 4 | **Грузовой седельный тягач MAZ 5440B9-420-031** (рег. знак № АМ 2491-3), инвентарный номер № 31459 (по бух. учету), год выпуска – 2011, цвет – зеленый | **15 270,12** | 1 527,01 |
| 5 | **Грузовой седельный тягач MAZ 5440A8 360 030** (рег. знак № АК 8115-3), инвентарный номер № 594г (по бух. учету), год выпуска – 2008, цвет – светло-синий | **902,60** | 90,26 |
| 6 | **Грузовой седельный тягач MAZ 6430A8 360 020** (рег. знак № АМ 5679-3), инвентарный номер № 5943г (по бух. учету), год выпуска – 2009, цвет – зеленый | **2 527,41** | 252,74 |

**Продавец**: **Государственное предприятие «Белоруснефть-Транс»,** ул. Книжная, 15Б, 246003, г. Гомель, Республика Беларусь. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8(029)249-56-43, инженер транспортного цеха – Терещенко Павел Александрович. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Республиканское дочернее унитарное предприятие «Белоруснефть-Транс»):** УНП 491317683, IBAN BY34 BPSB 3012 1728 2601 1933 0000, BIC (SWIFT) банка BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, назначение платежа – **задаток за участие в аукционе за лот №** (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 ноября 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 ноября 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **три дня** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3(трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2019 г. № 181 (29048). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029)126-66-62.**

Медыцына. Сучасны падыход

# ПРАМЯНЁВАЯ ТЭРАПІЯ: НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ І РЫЗЫКІ



**Выкарыстанне ў прамянёвай тэрапіі пацыентаў сучасных лінейных паскаральнікаў дапамагло звесці колькасць непажаданых пабочных рэакцый з боку арганізма да мінімуму. Як паведаміла на сустрэчы з журналістамі галоўны пазаштатны радыёлаг Міністэрства аховы здароўя, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела прамянёвай і комплекснай тэрапіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Ірына МІНАЙЛА, у розных медыцынскіх установах краіны сёння дзейнічаюць 15 лінейных паскаральнікаў, праўда, ёсць сярод іх як суперсучасныя апараты, так і тэхніка, якая ўжо выпрацавала свой рэсурс і патрабуе замены.**

— Прамянёвая тэрапія можа выкарыстоўвацца як у спалучэнні з хірургіяй і хіміятэрапіяй, так і як самастойны метад лячэння, — тлумачыць Ірына Мінайла. — Часам яе праводзяць перад аперацыяй для памяншэння памераў пухліны або пасля хірургічнага ўмяшання для знішчэння злаякасных клетак, якія маглі застацца. Нават у тых пацыентаў, якім нельга выдаліць пухліну, прамянёвая тэрапія дазваляе паменшыць яе памеры, аслабіць боль і палепшыць агульны стан хворага.

У прамянёвай тэрапіі ўжываецца медыцынскае іанізуючае выпрамяненне, у якасці якога звычайна выкарыстоўваюць высокаэнергетычныя фатоны або электронны пучок. Без медыцынскага фізіка такая тэрапія немагчымая: менавіта гэтыя спецыялісты дапамагаюць урачу выбраць «мішэнь» для апраменьвання, разлічыць правільныя дозы (штодзённыя і сумарныя), падвесці апраменьванне да пухліны і захаваць радыетэрапеўтычны інтэрвал (гэта значыць максімальна ўздзейнічаць на пухліну і мінімальна — на суседнія тканкі і крытычныя органы).

— Трэба «забіць» пухліну і ў той жа час абараніць здаровыя тканкі, — тлумачыць Ірына Мінайла. — Толькі ў гэтым выпадку прамянёвая тэрапія будзе апраўдана, таму што постпрамянёвыя пашкоджанні могуць быць дастаткова сур'ёзныя: гэта і радыёнекроз, і постпрамянёвыя язвы... Усе такія выпадкі абавязкова ставяцца на кантроль. Раннія прамянёвыя рэакцыі ўзнікаюць яшчэ ў працэсе лячэння, але ёсць і познія, якія праяўляюцца праз тры месяцы або нават праз некалькі гадоў. Магчымасці сучаснай тэхнікі дазваляюць нам цяпер зменшыць частату такіх ускладненняў. Прагрэс намеціўся пасля пераходу да аб'ёмнага планавання. Да сучасных методык трэба аднесці трохмерную і чатырохмерную прамянёвую тэрапію. Чатырохмерная прамянёвая тэрапія — методыка, пры выкарыстанні якой, акрамя геаметрычных параметраў пухліны ў трох вымярэннях, улічваецца яшчэ і «чацвёртае вымярэнне», гэта значыць, зрушэнне пухліны падчас фізіялагічнага акта дыхання. Такая методыка забяспечвае больш дакладнае падвядзенне лячэбнай дозы да рухомых пухлін, дазваляе значна зніжаць прамянёвую нагрузку на суседнія органы і тканкі. У 2017 годзе ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі таксама з'явіўся гаманож, які дазваляе працаваць з пухлінамі галаўнога мозга. Гэты апарат з іанізуючым выпрамяненнем прызначаны для правядзення высокадакладнага аднамомантнага апраменьвання розных паталагічных утварэнняў. Яго выкарыстанне амаль утрая зніжае імавернасць рэцыдываў метастазаў пасля лячэння.

Штодня ў Бараўлянах праводзіцца прамянёвая тэрапія прыкладна для 60—70 пацыентаў. А вось у Мінскім гарадскім анкалагічным дыспансеры амбулаторна праходзяць гэту медыцынскую працэдуру штодня да 100 мінчан. Чакаецца, што ў жніўні 2020 года завершыцца будаўніцтва новага дзевяціпавярховага корпуса дыспансера.

— Ён будзе вельмі сучасны, — паведаміла **намеснік галоўнага ўрача па радыелагічнай службе гэтай медыцынскай установы Галіна СІЛЬЧАНКА.** — Тут з'явяцца яшчэ чатыры новыя лінейныя паскаральнікі для правядзення прамянёвай тэрапіі, адкрыюцца два радыелагічныя аддзяленні на 60 ложкаў і два хірургічныя аналагічнай умяшчальнасці, з'явіцца іншае сучаснае дыягнастычнае абсталяванне. Паколькі анкалагічная захварвальнасць працягвае расці, трэба думаць на перспектыву. Эксплуатацыя такіх карпусоў, як правіла, разлічана на 50 гадоў. Акрамя абслугоўвання ў стацыянары, будзем праводзіць прыём амбулаторна: плануем павялічыць агульную колькасць пацыентаў, якія атрымліваюць прамянёвую тэрапію, да 400 чалавек штодня.

Дарэчы, у 2015 годзе ў Мінскім гарадскім анкалагічным дыспансеры былі ўстаноўлены два новыя сучасныя лінейныя паскаральнікі. Сёння, напрыклад, тут практыкуюць прамянёвую тэрапію з кантролем дыхання. Падобная методыка прымяняецца ў дачыненні да пацыентак з пухлінамі левай малочнай залозы і пры іншых пухлінах органаў грудной клеткі, калі важна абараніць сэрца і лёгачныя тканкі ад уздзеяння іанізуючага выпрамянення. Праведзеныя міжнародныя даследаванні пацвердзілі высокую рызыку развіцця цяжкай сардэчнай паталогіі праз некалькі гадоў пасля правядзення прамянёвай тэрапіі ў пацыентаў з такім дыягназам. Нават самыя сучасныя методыкі лячэння не могуць абмежаваць дозу, якую атрымлівае сэрца. Прамянёвая ж тэрапія на глыбокім удыху дазваляе змяніць анатомію і вывесці вобласць сэрца і каранарных артэрый з зоны высокай дозы. А павелічэнне аб'ёму лёгачнай тканкі мінімізуе сярэднюю лёгачную дозу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Лепш прадухіліць

# Экзатычныя і небяспечныя

## Малярыю, ліхаманку Дэнге, адзёр і іншыя хваробы беларусы працягваюць прывозіць з-за мяжы

**Каля 200 выпадкаў адру зафіксавана сёлета ў Беларусі. Чвэрць з іх — завозныя, астатнія — звязаныя з імі. Прывозяць беларусы з іншых краін і экзатычныя хваробы — малярыю, ліхаманку Дэнге і ліхаманку Заходняга Ніла, гепатыт А. Як падстрахавацца перад выездам за мяжу і чым небяспечныя экзатычныя інфекцыі, расказалі спецыялісты.**



dni24.com

— Еўрапейскі рэгіён палае ад адру. З 53 краін у 49 зарэгістравана каля 200 тысяч выпадкаў захворвання. Найбольшая колькасць — ва Украіне, там каля 54 тысяч чалавек перанеслі гэту інфекцыю. За два гады 41 чалавек памёр, яшчэ 20 загінулі ад ускладненняў, якія далучыліся пасля адру, — расказвае **загадчык аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Уладзімір ПАШКОВІЧ.**

У Беларусі сёлета больш за ўсё выпадкаў адру зарэгістравана ў Гродзенскай вобласці — 54. У Мінску — 49, у Віцебскай вобласці — 30, Гомельскай — 26, Брэсцкай — 19, Мінскай — 15, Магілёўскай — 6.

— Апошнія тры тыдні мы не бачым новых выпадкаў. Усіх кантактных з хворымі абследуем. Ланцужок звычайна складае 1—5 выпадкаў. Гэта сведчыць пра тое, што наша насельніцтва добра абаронена.

Пры гэтым спецыяліст нагадаў, што адзёр мае самую высокую кантагіёзнасць. Гэта аэразольная інфекцыя: каб захварэць, дастаткова пабыць у адным памяшканні з хворым.

— Калі з'яўляецца хворы, то ў 99 % выпадкаў кантактная з ім асоба захварэе. Наша краіна — адна з нямногіх у Еўропе, дзе ліквідаваны незавазныя і не звязаныя з імі выпадкі адру. Больш за 98% насельніцтва прышчэплены. Апошнім часам мы вакцынавалі каля 1,5 тысячы тых, хто не быў прышчэплены ці адмаўляўся ад вакцынацыі. Акрамя таго, Расспажыўнагляд выдзеліў нам 100 тысяч доз вакцыны супраць адру, якой мы прышчапілі 83,6 тысячы чалавек з груп рызыкі — медработнікаў, супрацоўнікаў пагранічных пунктаў пропуску, бежанцаў і іншых, — падкрэсліў Уладзімір Пашковіч.

Нагадаем, што Нацыянальны каляндар прадугледжвае дзве прышчэпкі ад адру — у год і ў шэсць гадоў. Калі ў вас няма звестак пра прышчэпкі, ці калі зроблена толькі адна з іх, або вы не хварэлі на адзёр раней, спецыялісты рэкамендуюць зрабіць прышчэпкі ў любой медыцынскай установе перад паездкай у краіны з неспрыяльнай эпідсітуацыяй — Украіну, Казахстан, краіны ЕС. Калі вы вярнуліся з паездкі з сімптомамі інфекцыі — сыпам, кашлем, кан'юктывітам — неабходна звярнуцца па медыцынскую дапамогу і расказаць доктару пра паездку.

З экзатычных завазных інфекцый на першае месца ў Беларусі выйшла малярыя. Яе прывозяць з Афрыкі. Захворванне перадаецца праз камарыныя ўкусы, і калі не прымаць прэпараты, магчымае заражэнне. Таксама сёлета зарэгістравана шэсць выпадкаў ліхаманкі Дэнге, адзін — ліхаманкі Заходняга Ніла. Прывозяць штогод і каля пяці выпадкаў гепатыту А.

— Малярыя — даволі небяспечнае захворванне. Мне давялося быць экспертам па адным выпадку, дзе пацыент, на жаль, загінуў, — расказвае **прафесар кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук Сяргей ЖАВАРОНАК.** — Жыхар аднаго з раённых цэнтраў працаваў пэўны час у Афрыцы. Па прыездзе з сімптомамі звярнуўся да ўрача, але выратаваць яго не ўдалося — на працягу сутак пацыент загінуў. Рэч у тым, што да звычайных прэпаратаў трапічная малярыя ўстойлівая. А ў нас, на жаль, ёсць праблемы з рэзервам неабходных у такіх выпадках сродкаў і пастаноўкай дыягназу на перыферыі.

Яшчэ адно небяспечнае захворванне — дыфтэрыя, і яе ўспышкі фіксаваліся ва Украіне. Аднак у нас ад гэтай інфекцыі прафілактычнымі прышчэпкамі абаронена 98 % насельніцтва.

— Кантагіёзнасць дыфтэрыі ў параўнанні з адром нізкая. Апошнія тры гады мы гэта захворванне не выяўлялі. Але ведаць свой прышчэпачны статус трэба, — падкрэсліў Уладзімір Пашковіч. — Прышчэпкі ад дыфтэрыі і слупняку робіцца раз на 10 гадоў усім дарослым: у 16, 26, 36 і гэтак далей. Дыфтэрыя небяспечная тым, што праз некалькі дзён у хворага з'яўляюцца міякардыты.

Медык папярэдзіў і пра яшчэ адну небяспечную інфекцыю — гепатыт Е, на які даволі шырока хварэюць свінні. Заразіцца можна, калі ўжываць дрэнна апрацаванае свіное мяса ці печань.

**Алена КРАВЕЦ.**

Факт

## РАДЫЕЎЗДЗЕЯННЕ АЭС ДАПУШЧАЛЬНАЕ

**Экспертная камісія Міжнароднай грамадскай экалагічнай экспертызы матэрыялаў дала вынікове заключэнне, якое абумоўлівае экалагічную бяспеку Беларускай АЭС.**

У ім адзначана, што магчымае ўздзеянне на наваколле падчас работы станцыі знаходзіцца ў дапушчальных межах, а рэгулярнае інфармаванне насельніцтва пра рэалізацыю праекта пасадзейнічала павышэнню актыўнасці зацікаўленых.

Яшчэ ў верасні незалежная група экспертаў з васьмі краін: Літвы, Казахстана, Венгрыі, Аўстрыі, Італіі, Украіны, Расіі і Беларусі па ініцыятыве Мінэнерга і пры падтрымцы Фонду садзейнічання развіццю муніцыпальных утварэнняў «Асацыяцыя тэрыторый размяшчэння атамных электрастанцый» комплексна прааналізавала дакументы, якія абумоўлівалі экабяспеку станцыі. Эксперты падкрэслілі, што вымераны да размяшчэння ядзернага паліва і пачатку эксплуатацыі станцыі «нулявы фон» стане рэперным пунктам для далейшай ацэнкі радыеэкалагічнага ўздзеяння АЭС. З уводам АЭС у эксплуатацыю Беларусь становіцца дзяржавай — членам ядзернага клуба, якая валодае даследчымі ядзернымі ўстаноўкамі, навуковай базай і сучаснай атамнай станцыяй, гаворыцца ў дакуменце.

**Ірына СІДАРОК.**

## ПРЫКРЫЛАСЯ ДЗІЦЕМ?

**Скрадзеныя прадукты жанчына вывезла ў калясцы.**

У Гродне мясцовая жыхарка 1982 года нараджэння здзейсніла буйны крадзеж з крамы па вуліцы Дубко. Грамадзянка, якая знаходзіцца ў сацыяльным водпуску па доглядзе дзіцяці, была ў гіпермаркеце «Еўраопт». Жанчына з дзіцячай каляскай, у якой было дзіця, хадзіла па гандлёвых радах. Тавар клала як у адсекі каляскі, так і ў прадуктовы кошык. Потым на касе заплаціла за пакупкі з апошняга, а вось пра наяўнасць тавару ў калясцы не паведаміла. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, у выніку падазраваная не расплацілася за 29 найменняў на агульную суму 370 рублёў. Далёка грамадзянка сысці не змагла і была затрыманая на выхадзе з крамы. Крымінальная адказнасць за падобныя дзеянні прадугледжана па артыкуле «Крадзеж».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Лэдзі, панны, сеньярыты...

**Сёння ў сталіцы Японіі фінішуе адзін з самых буйных і вядомых у свеце конкурсаў прыгажосці — «Miss International». Ён праходзіць ужо 59-ы раз і аб'ядноўвае ўдзельніц з 83 краін і тэрыторый, у тым ліку Буркіна Фасо і Экватарыяльнай Гвінеі. Нашу краіну на конкурсе прадстаўляе 22-гадовая бабруйчанка Марыя Первій.**




**Даведка «Звязды»**

Самы вялікі ганарар Рымскай імперыі атрымаў паэт Апіян. Імператар Марк Аўрэлій заплаціў яму па залатой манеце за кожны радок паэмы. За сваю працу паэт атрымаў 20 тысяч манет золатам.



Адна з самых незвычайных кніг — «Боская камедыя» Дантэ, створаная Габрыэлем Чэлані на адным аркушы паперы памерам 800х600 міліметраў. На ім змясцілася 14 тысяч радкоў, пры гэтым прачытаць іх можна без павелічальнай тэхнікі. Калі ж глядзець на кнігу з адлегласці, то атрымліваецца карта Італіі. На яе стварэнне манах Чэлані патраціў чатыры гады.

Каб кнігі былі такія ж танныя, як цыгарэты, выдавецтва Penguin пачало выкарыстоўваць мяккую вокладку. Першыя такія кнігі распаўсюджвалі ў цэрквах.

Бібліяклептаман — гэта чалавек, які крадзе кнігі. Стывен Блумберг, самы вядомы кніжны злодзей, скраў больш за 23 тысячы рэдкіх асобнікаў кніг. Цяпер яго калекцыя каштуе каля 20 мільёнаў долараў.

Паводле падлікаў Google, усяго ў свеце існуе амаль 130 мільёнаў назваў кніг (сюды ўвайшлі ўсе мастацкія, публіцыстычныя і навуковыя працы).

У сярэднявечнай Еўропе кнігу, каб яе не вынеслі з грамадскай бібліятэкі, прыкоўвалі да паліцы ланцугамі. Іх даўжыня дазваляла здымаць кнігі з паліц і чытаць, але не выносіць з сабой. Гэты метад абароны ад крадзяжоў выкарыстоўвалі да XVIII стагоддзя, таму што кнігі ў той час былі вельмі дарагія.

Кніга вядомага галандскага лекара Германа Бурхаве пад назвай «Адзіныя і найглыбейшыя сакрэты медыцынскага мастацтва» была прададзеная за 10 тысяч долараў. Калі пячатку на ёй зламалі, высветлілася, што яе старонкі чыстыя. Толькі тытульны ліст абвяшчаў: «Трымай галаву ў холадзе, ногі ў цяпле, і ты зробіш бедняком найлепшага лекара».

Праца Леанарда да Вінчы аб вадзе, зямлі і нябесных целах пад назвай «Лестэрскі кодэкс» лічыцца адной з самых дарагіх кніг у свеце. Каб стаць яе ўладальнікам, Біл Гейтс заплаціў больш за 30 мільёнаў долараў. Саму кнігу трэба чытаць толькі з люстэркам, таму што яна напісана люстраным спосабам.

У творах Шэкспіра слова «любоў» сустракаецца амаль у 10 разоў часцей, чым слова «нянавісць» (2259 і 229 разоў адпаведна).

Усім вядомае і блізкае «кніжны чарвяк» з'явілася дзякуючы маленькім казуркам, якія ядуць карашкі кніг.




## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Рапс» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1 (повторный аукцион): имущество в составе:**

**здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением** (в состав входят: здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением, пристройка, площадка, ограждение) **с инвентарным номером № 600/С-121223 общей площадью 774,3 кв. м,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000140 площадью 0,6032 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, 7, район д. Аннополь и **здание пропускного пункта с инвентарным номером № 600/С-121220 общей площадью 21,7 кв. м,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000143 площадью 0,0249 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район д. Аннополь.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 233 109,72 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **23 310,00 бел. руб.**).

**Условия продажи:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Лот № 2: склад с инвентарным номером 600/С-160798 общей площадью 545,7 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000151 (право аренды) площадью 0,1031 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, 8/1, район аг. Крупица.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: водоохранная зона рек и водоемов, площадь 0,1031 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0,0018 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 98 160,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **9 816,00** бел. руб.).

**Условия продажи:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Победитель торгов (либо единственный зарегистрированный участник аукциона, согласный приобрести имущество путем повышения начальной цены на 5 %) обязан оплатить стоимость капитального строения в рассрочку на 1 год равными долями не позднее последнего рабочего дня начиная с месяца, в котором будет осуществлена государственная регистрация договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 4 (четыре) процента, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. По лоту № 1 предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 18.10.2018, 18.12.2018 и 24.08.2019. Аукцион состоится **17.12.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.12.2019** до **14.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**


Жывая прырода

# НАВУКОЎЦЫ ЗНАЙШЛІ БЕССМЯРОТНАГА СЛІЗЕВІКА

## Ён нагадвае монстраў з фантастычных фільмаў

**Парыжскі заапарк прадставіў свету свой новы экспанат — загадкавую аднаклетачную істоту, якая падобна на грыбы, паводзіць сябе, як жывёла, здольная рэгенерыраваць і валодае аж 720 паламі.**




Навукоўцам яшчэ трэба будзе адказаць на многія звязаныя з ім пытанні, аднак цяпер кожны ахвотны можа назіраць містычную жоўтую плёнку, якая ўжо атрымала імя ў гонар фільма жахаў 1958 года Blob (кропля, клякса, згустак).

Згаданы клас істот да гэтага часу не атрымлівалася ўпісаць у якое-небудзь канкрэтнае царства жывёльнага свету. Іх называюць слізевікамі, і ў прыродзе налічваецца каля тысячы відаў гэтай групы арганізмаў, кожны з якіх здольны паставіць у тупік нават дасведчанага біёлага. Напрыклад, Blob з'яўляецца аднаклетачным, хоць яго памер дасягае некалькіх сантыметраў. Ён можа расці практычна бясконца, перамяшчацца з хуткасцю чатыры сантыметры ў гадзіну, а таксама шукаць ежу і пераправаўляць яе. Пры гэтым «кропля» праяўляе прыкметы таго, што яна здольная навучацца перадаваць свой вопыт іншым асобінам. У адным з эксперыментаў слізевік павінен быў знайсці выхад з лабірынта. Пасля паспяховага выканання Blob выбіраўся з пасткі хутчэй, а калі яго змясцілі побач з іншай асобінай, тая таксама змагла вырашыць задачу хутка.



Кадр з фільма «Жывое».

Як паведамляе Reuters, пры гэтым слізевік практычна бессмяротны: калі яго рассячы на часткі, сваю цэласнасць ён адновіць за лічаныя хвіліны. Небяспеку для яго ўяўляюць толькі засуха і крытычныя тэмпературы, прычым нават у гэтым выпадку ён хутчэй за ўсё проста ўпадзе ў стан блізкі да анабіёзу. Гарантавана знішчаюць Blob толькі магутнае ультрафіялетавае выпраменьванне і агонь. У прыродзе «кропля» камфортна жыве пры вільготнасці каля 85—100 % і тэмпературы паветра 19—25 градусаў Цэльсія, а харчуецца рознай арганікай, напрыклад драўнінай.

Упершыню гэты від трапіў у фокус увагі навукоўцаў у 1973 годзе, калі жыхарка Тэхаса знайшла ў сябе на заднім двары загадкавую жоўтую субстанцыю. Сваю назву гэты слізевік атрымаў у гонар трэшавага амерыканскага фільма жахаў канца 1950-х, згаданага вышэй. Па сюжэце іншапланетная слізь паглынае ўсё на сваім шляху і знішчае цэлы горад. Варта адзначыць, што аналагічныя механізмы распаўсюджвання пазаземнай брыдоты сустракаюцца і ў іншых фільмах: «Нешта» (1982 год, рэжысёр Джон Карпентэр), «Эвалюцыя» (2001 год, Айвэн Райтман) і «Жывое» (2017 год, Дэніэль Эспіноса).

**Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

# МОДНАЯ... ВЫЦІНАНКА,

## або Як вырабы нашых бабуль становяцца беларускім брэндам

**ГЭТЫ від мастацтва зарадзіўся ў сялянскіх хатах і пачаўся... з нажніц для стрыжкі авечак. Калі ў жанчын практычна не было сродкаў і магчымасцяў упрыгожыць свой дом, яны выкарыстоўвалі выцінанку — адмысловую тэхніку ўзорыстага выразання з паперы — і з яе дапамогай стваралі ажурныя ўпрыгажэнні для «покуці» з абразамі, аконных праёмаў, шаф, паліц і г. д. Паступова з'яўляліся ўсё больш складаныя кампазіцыі, вартыя нават найлепшых галерэй свету... Таму, калі я даведалася, што мастачка Алена ШАЛІМА праводзіць выстаўку выцінанкі «Папяровыя мары» і прапануе майстар-клас, паспяшалася запісацца.**



### КАРЫКАТУРА... З ПАПЕРЫ

Мы сустракаемся з мастачкай у арт-гасцёўні «Высокае мѣста» і праходзім у выставачную залу, дзе ў мяне адразу аднімае мову. На белых сценах — вялікія графічныя карціны-ручнікі памерам каля двух метраў. Цяжка ўявіць, што ўсе яны зроблены з паперы. Сюжэты родныя і вядомыя: тут і нашы гарады, і героі міфалогіі, і нават фрагменты гісторыі дзяржавы. Гэта незвычайнае мастацтва. Чаму? З аднаго боку — шматграннасць і глыбіня сэнсаў. З другога — матэрыял, з якога зроблены твор, стварае адчуванне далікатнасці і недаўгавечнасці.

Майстар прызнаецца, што працаваць з вялікімі ручнікамі даволі складана, бо трэба ўтрымаць велізарнае палатно паперы. Яно не павінна разваліцца і страціць форму:

— Таму невялікія каляровыя ўкрапіны ў маіх манахромных работах маюць не толькі дэкаратыўнае, але і практычнае прызначэнне — яны дапамагаюць твору не пашкодзіцца і пры гэтым заставацца сюжэтна цэласным. Большасць работ з чорнай паперы, але доўгі час знайсці патрэбную колькасць матэрыялу было праблемай, даводзілася фарбаваць газетную паперу тушшу.

Творы выглядаюць настолькі мудрагелістымі, што цяжка ўявіць, колькі часу можа на іх пайсці. Алена ўсміхаецца: «Некаторыя выразаюцца і за дзень. А вось на пошукі ідэі можа спатрэбіцца і некалькі гадоў. Да таго ж, я не раблю накіды, усё трымаю ў галаве».

На выстаўцы сабрана больш за 50 работ. Мастачка кажа, што «Папяровыя мары» — гэта своеасаблівая справаздача за 15 гадоў.

Пакуль любуюся ручнікамі, чую, як наведвальніца ўсклікае: «Гэта ж Якуб Колас!» Абарочваюся — сапраўды, відаць партрэтнае падабенства. Выцінанка — гэта не толькі ўзоры і сюжэты, у Алены Шалімы ёсць вялікі цыкл партрэтаў і нават карыкатур.

### ЧАМУ ПРА ЯЕ ЗАБЫЛІСЯ?

— Выцінанка лічыцца народным мастацтвам, але і паны таксама выразалі з паперы, — расказвае Алена, праводзячы мяне ў наступную залу. — Праўда, яны больш практыкавалі выразанне сілуэтаў, партрэтаў, біблейскіх сюжэтаў. Уклейвалі іх у альбомы ці аздаблялі рамкамі пад шкло. Для такіх работ патрэбна мастацкая адукацыя і больш тонкія прылады. Нажніцамі для стрыжкі авечак мудрагелісты сюжэт не зрабіць. Простыя людзі знайшлі іншы прыём: шматразова складвалі паперу, рабілі свае ўзоры і настроі. Газетную паперу выбельвалі, высушвалі і стваралі аздабленне сваіх хат.

Малюнак залежаў ад прызначэння вырабу, ад фантазіі і ўмення аўтара і, вядома, ад рэгіёна, у якім ён ствараўся. Бо кожная мясцовасць мела свае сімвалы і знакі, што маглі захавацца яшчэ з паганскіх часоў. Для беларускай выцінанкі характэрныя геаметрычныя ўзоры, радзей раслінныя, зааморфныя, антрапаморфныя матывы, падобныя на вышываныя, разьбяныя і маляваныя. Пік развіцця выцінанкі прыпаў на другую палову XIX — першую палову XX стагоддзя, цяжкія часы пасляваеннага аднаўлення. Гаспадыням вельмі хацелася наладзіць і ўпрыгожыць мірнае жыццё. Даволі простая тэхніка выцінанкі і таннасць матэрыялу дазвалялі гэта зрабіць.

— А потым адбудавалі пасля вайны фабрыкі і заводы, з'явілася больш тканін, — расказвае Алена. — Працадні паступова змяніліся на зарплату, і людзі пачалі купляць гатовыя прадметы дэкору. У дамах засталіся толькі сурвэткі і папяровыя ўзоры на вокнах зімой, але і яны з часам перасталі быць моднымі.

Цяпер, дзякуючы выдатным майстрам, выцінанка пакрысе ажывае. Але гэтага ўсё роўна недастаткова для паўнацэннага адраджэння.

Мастачка перакананая, што ўсе віды творчасці «раскручваюцца» пэўным чалавекам. Таму патрэбен рухавік. Напрыклад, такі, якім стала Вікторыя Мікітаўна Чырвонцава — заснавальніца маладзечанскай школы выцінанкі ў 80-х гадах XX стагоддзя. Яна адкрыла шмат індывідуальных творчых асоб, праявіла настойлівасць у папулярызацыі выцінанкі. Дзякуючы яе намаганням Маладзечанскі музычны каледж імя Агінскага стаў развіваць гэты кірунак і ўключыў работу з паперай у пералік спецыялізацый. Або Вячаслаў Дубінка — беларускі пісьменнік, журналіст, мастак, фатограф і майстар народнай творчасці, якога Алена лічыць сваім настаўнікам.

Пяцьдзясят гадоў таму дзядуля Алены Шалімы, Уладзімір Дагаеў, працаваў фатографам у рэдакцыі газеты «Звязда». Менавіта там яны з Вячаславам Дубінкам і пазнаёміліся.

— А я часта бывала ў дзядулі. Аднойчы Вячаслаў Андрэевіч прынёс невялікі папяровы матыў і паказаў мне, але ў той момант мне гэта было нецікава, а папера здавалася несур'ёзным матэрыялам. Выцінанку бабуля паклала ў кніжку, і такім чынам яна цудоўна захавалася. Цяпер яна вісіць у рамцы на сцяне ў маім доме. Потым з Дубінкам я сустрэлася ўжо ў свядомым узросце. Прыйшла на яго выстаўку, мы пагаварылі. Так завязаліся нашы зносіны і сяброўства, а я пачала прыглядацца да мастацтва выцінанкі.






### АД МАГІІ ДА ЦІШОТКІ

У 2003 годзе Алена захацела ўступіць у Саюз майстроў народнай творчасці. Але ёй сказалі, што атрымаць пасведчанне сябра саюза — нялёгкая справа. Яна ўспрыняла гэта як выклік і за кароткі час зрабіла некалькі сюжэтаў на тэму беларускай міфалогіі, з якімі ў выніку і была прынятая ў саюз.

Варта паспрабаваць?

Пытаюся, як Алена вызначыла б сваё прызначэнне.

— Папулярызатар. Я хачу прыцягнуць да культуры як мага больш людзей. А выцінанка — гэта найбольш даступны спосаб з прыкладной творчасці. Гэта беларускі брэнд, проста пакуль не вельмі раскручаны. Але мы над гэтым працуем. Выцінанка павінна набыць практычнае значэнне, інакш, як у выпадку з любым «замкнутым» відам культуры, яна паступова знікне. Але сёння яна можа быць усюды: адзенне, посуд, вітражы... Я хацела б зрабіць лінейку сукенак з рознымі матывамі. Мы з Symbal.by ўжо выпусцілі некалькі рэчаў з такімі малюнкамі. Часам бачу чалавека ў цішотцы са сваёй работай — гэта надзвычай прыемна. Мару, каб выцінанка была на сценах дамоў, пакетах і скрынках, на пасцельнай бялізне і адзенні, на тых вырабах, якія людзі трымаюць у руках і бачаць кожны дзень.

— А яшчэ гэта добры антыстрэс, — далучаецца да размовы мастачка Наталля Гамаюнава, пакуль мы рыхтуемся да выразання. — Нядаўна Цэнтр падтрымкі анкапацыентаў «У імя жыцця» папрасіў нас даць майстар-клас па выцінанцы для людзей, якія рэабілітуюцца пасля аперацыі. Яны вымушаныя шмат ляжаць і практычна нічым не занятыя. А выцінанка вельмі простая ў выкананні, для якога не патрэбны адмысловыя навыкі, пацыенты могуць рабіць тое лежачы або седзячы. Гэта дапамагае выйсці з негатыўнага стану.

Алена прыклала да ліста аранжавай паперы далонь, абвяла па контуры і выразала. Яшчэ пара рухаў — перада мной Фенікс, якога мастачка стварыла за хвіліну.

— Усе матэрыялы літаральна ў вас пад рукой, — усміхаецца Алена, маючы на ўвазе, што выцінанка створана дзякуючы контуру далоні.

...Сыходжу з пачуццём, што дакранулася да чагосьці чароўнага. І хоць я толькі што бачыла, як узнікае гэтая магія, усё ж не магу паверыць: няўжо такія цуды ствараюцца чалавекам? Няўжо гэтаму можна навучыцца? Няўжо ўсё гэта — наша, беларуская, культура?

Сапраўды, яна вартая таго, каб мы змагаліся за яе адраджэнне.

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**



**Алена Шаліма — сябра Беларускага саюза майстроў народнай творчасці і Беларускага саюза дызайнераў. Займаецца мастацтвам выцінанкі больш за 15 гадоў. Апошнім часам распрацоўвае тэму «Ручнікі ў выцінанцы». Работы мастачкі неаднаразова выстаўляліся ў Беларусі, Латвіі, Літве і Польшчы.**

Без грыфа «сакрэтна»

# ГІСТОРЫЮ ТРЭБА ПАДАВАЦЬ КОМПЛЕКСНА

**Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь выдаў зборнік дакументаў «НКУС у Заходняй Беларусі. Верасень — снежань 1939 года».**

Раней ужо выходзілі выданні, падрыхтаваныя гісторыкамі і архівістамі Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы, якія апісвалі ваенна-палітычныя падзеі 1939 года, сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя пераўтварэнні, што праводзіліся ў Заходняй Беларусі. Асобныя выданні былі прысвечаны і НКУС, але ў іх увага пераважна аддавалася рэпрэсіям. Але многае з таго, чым у той час яшчэ займаліся чэкісты, засталося незаўважаным.

Упершыню ў зборніку друкуюцца дакументы кіраўніцтва НКУС як цэнтральнага, так і абласнога і раённага ўзроўняў.

У архівах маецца мноства дакументаў па гісторыі тых падзей — законы БССР, дэкларацыі Народнага сходу Заходняй Беларусі, пастановы, інструкцыі, пратаколы пасяджэнняў, тэлеграмы ЦК КП(б)Б, аператыўныя зводкі НКУС, дакладныя запіскі наркаматаў БССР, а таксама дакументы камандавання Беларускага фронту. Значная іх частка ўтрымлівае інфармацыю аб тэрытарыяльным размежаванні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, усталяванні новай улады, нацыяналізацыі прамысловасці, банкаўскіх і культурных устаноў, рэарганізацыі школьнай адукацыі, падрыхтоўцы да выбараў. Вялікі інтарэс уяўляюць звесткі пра ўвядзенне ў Заходняй Беларусі савецкай валюты, перавод стрэлак гадзіннікаў у адпаведнасці з мінскім часам. Уз'яднанне дало новы штуршок для развіцця краіны — дзякуючы тым падзеям мы сёння маем тэрыторыю, якая па плошчы займае 13-е месца ў Еўропе.





«Пры падрыхтоўцы публікацый мы вырашылі больш увагі звярнуць на дзейнасць органаў НКУС у галіне рашэння эканамічных, палітычных праблем, якія ўзніклі пасля ўваходу Чырвонай арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі, — расказвае **адзін са складальнікаў зборніка, кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіва Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ**. — Асаблівую цікавасць уяўляюць аналітычныя матэрыялы, якія органы НКУС падавалі кіраўніцтву краіны і рэспублікі. У іх адлюстраваны пытанні аб адносінах насельніцтва да ўваходу Чырвонай арміі, праблема бежанцаў, якая ўзнікла ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі Германіі, і цэлы шэраг эканамічных праблем».

Увядзенне ў абарот такіх дакументаў дазволіць знайсці адказ на многія спрэчныя пытанні. У прыватнасці, зразумець стаўленне насельніцтва далучаных земляў да новай улады. Важна ўлічваць, што насельніцтва было шматнацыянальнае: тут пражывалі беларусы, палякі, яўрэі, літоўцы. Натуральна, адносіны розных груп насельніцтва не супадалі. Так, калі беларусы ўваход Чырвонай арміі віталі, урачыста сустракалі, то большасць палякаў заняла антысавецкія пазіцыі, пачалося супраціўленне.

Архівісты адшукалі цікавы дакумент у фондзе ЦК, які сведчыць аб вылучэнні да ўзнагароджання работнікаў НКУС за ўдзел у вызваленчым паходзе. Названыя прозвішчы 89 чэкістаў і канкрэтны ўнёсак кожнага. Падобныя дакументы дазваляюць падаваць гісторыю больш персаніфікавана, бо звычайна гаворыцца толькі пра падзеі, а не пра людзей.

У зборніку можна знайсці і дакладную запіску чэкістаў пра погляды прафесара Пічэты па пытаннях вызвалення Заходняй Беларусі. Чэкісты таксама сачылі і за маральным абліччам савецкіх вайскоўцаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленчым паходзе. Тым больш што савецкім афіцэрам давялося сутыкнуцца з сур'ёзнай спакусай — на вызваленых тэрыторыях яны ўбачылі крамы, багатыя на разнастайныя тавары, якіх не было ў краіне Саветаў.

Даследчыкам варта звярнуць увагу і на дакументы, якія сведчаць пра стан вайсковых часцей. Дакладныя запіскі асобага аддзела Беларускага фронту сведчаць пра дрэнную матэрыяльную частку і негатоўнасць арміі. Варта нагадаць, што падчас вызваленчага паходу сур'ёзных баявых дзеянняў не вялося. Калі б недахопы, пра якія дакладалася ў 1939 годзе, былі ўлічаны, то можна было б пазбегнуць тых сур'ёзных страт, якія панесла Чырвоная армія і ў вайне з Фінляндыяй, і ўлетку 1941 года.

Пры знаёмстве са справаздачамі, дырэктывамі, аператыўнымі зводкамі, інфармацыйнымі і дакладнымі запіскамі можна ўбачыць, якія задачы ставіліся перад спецслужбай вышэйшым палітычным кіраўніцтвам СССР і партыйна-савецкім кіраўніцтвам БССР, чым займаліся канкрэтныя аператыўныя групы. І гэта не толькі сачэнні і рэпрэсіі (дарэчы, у зборніку можна знайсці дакумент, які сведчыць пра колькасць затрыманых на тэрыторыі Заходняй Беларусі). Таксама чэкісты павінны былі не дапусціць хаосу, марадзёрства і бандытызму, ахоўваць важныя аб'екты, вырашаць праблемы забеспячэння бежанцаў харчаваннем. Архівісты заўважаюць, што да падзей 1939 года можна ставіцца па-рознаму: былі і станоўчыя моманты, і адмоўныя з'явы, але вывучаць гісторыю трэба комплексна, і новы зборнік павінен паспрыяць гэтаму.

Адначасова з прэзентацыяй зборніка Нацархіў паказаў унікальныя дакументы, звязаныя з падзеямі 1939 года. Так, у архіве захоўваецца пастанова СНК, дэкларацыя аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, пастановы, пратаколы, тэлеграмы Сталіну за подпісам Панамарэнкі. Таксама тут знойдзеце і сцэнарый фільма «За Беларусь Савецкую», які датаваны 1939 годам, і спіс фільмаў, якія рэкамендаваліся кінатэатрам для паказу, тагачасныя карты падзелу рэспублікі на раёны. Архівісты звярнулі ўвагу на карту 1939 года, дзе паказана дэмаркацыйная лінія паміж германскай і савецкай арміямі. Па лісце карыстання бачна, што даследчыкі з ёй амаль не працавалі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Сведкі геадэзічных работ XIX стагоддзя

## Сучасныя даследаванні пацвярджаюць высокую дакладнасць апошніх

**Вучоныя БДУ выявілі геадэзічныя пункты Цэнтральнаеўрапейскай дугі ўзростам больш за 180 гадоў. Даследчая работа вялася на працягу 2018—2019 гадоў пры ўдзеле супрацоўнікаў кафедры геадэзіі і касмааэракартаграфіі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ і вядучых спецыялістаў Белгеадэзіі і кампаніі «Крэда-Дыялог», паведамляе прэс-служба вядучай айчыннай ВНУ.**

Перад пачаткам работ былі вывучаны навуковыя справаздачы і картаграфічныя матэрыялы XIX—XX стагоддзяў. Палявыя даследаванні па адшуканні цэнтраў геадэзічных пунктаў праводзіліся на тэрыторыі Капыльскага, Любанскага, Старадарожскага і Клецкага раёнаў. Усяго ўстаноўлена дакладнае месцазнаходжанне шасці пунктаў. Цэнтры, якія захаваліся, закладзены на 50 сантыметраў ніжэй узроўню зямлі і ўяўляюць сабой каменны мур у форме куба з даўжынёй рабра адзін метр. У цэнтры мура ўстанаўлівалася цагліна, і на ёй адзначаліся каардынаты.

Усяго на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў перыяд з 1827 да 1866 года закладзена 52 пункты, якія ўваходзяць у Градуснае вымярэнне паралелі. Правядзенне астранамічных і геадэзічных вымярэнняў патрабавалася для ўстанаўлення формы і памераў зямнога эліпсоіда.

Геадэзічныя пабудовы пазамінулага стагоддзя з'яўляюцца гістарычнай спадчынай айчыннай навукі. Пошукавыя работы навукоўцаў, геадэзістаў і картографаў неабходныя для захавання унікальных аб'ектаў і ўключэння іх у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Падобныя даследаванні дазваляюць правесці параўнальны аналіз геадэзічных работ у разрэзе розных эпох. Сучасныя вызначэнні з выкарыстаннем спадарожнікавых сістэм пацвярджаюць высокую дакладнасць правядзення астранамічных і геадэзічных работ XIX стагоддзя.

Падрабязныя вынікі палявых экспедыцый навукоўцы прадставяць на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Геаматыка: адукацыя, тэорыя і практыка», якая адбудзецца 20—22 лістапада на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ ў Мінску.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даведка

**Цэнтральнаеўрапейская дуга паралелі — градуснае вымярэнне ўздоўж паралелі 52 паўночнай шыраты, якое працягнулася на 63° 31' па даўгаце (больш чым шостая частка ўсёй паралелі). Агульная працягласць дугі ад вострава Валенсія (Ірландыя) на захадзе да горада Орска (Расія) на ўсходзе складае 4360 кіламетраў, такім чынам, яна перасякае практычна ўсю Еўропу. На тэрыторыі Беларусі даўжыня дугі перавышае 530 кіламетраў.**

Практычнае радзімазнаўства

# ЖЫЛА-БЫЛА АДНА ВЁСКА

**У Столінскім раёне Брэсцкай вобласці ёсць вёска Асавая з багатай і цікавай гісторыяй. Паводле padання, на яе тэрыторыі ў дахрысціянскія часы было паганскае капішча — яно і цяпер, сцвярджае пінскі эколаг-краязнавец Дуброўскі, захавалася пад назвай «Горкі».**

У пісьмовых крыніцах вёска ўпершыню згадваецца ў XVI стагоддзі — так, у месцічаў Карповічаў захоўваецца радавод з 1503 года. Тады браты Карповічы атрымалі ва ўласнасць зямлю ў Асоўскай пушчы і стварылі тут паселішча. З імі прыехалі сяляне, якія aселі на ўрадлівых землях па суседстве — чатыры браты Лукшы (лучнікі), і называліся яны асоўцы, а шляхецкі засценак — Асова Палеская. Мясцовая шляхта была каталіцкага веравызнання, таму збудавала касцёл акурат каля капішча, а яго знішчылі. Цікава, што на другім баку рэчкі Залятынкі была пабудавана праваслаўная царкоўка невялікага памеру — месца і сёння называецца Цэрквішча, а каля яго ў розны час знаходзілі рэшткі пахаванняў. У сярэдзіне XIX стагоддзя касцёл таксама пераўтварылі ў праваслаўную царкву, пры якой адкрылі царкоўнапрыходскую школу, а ў 1879 годзе ўзвялі званіцу. Званіца, хоць і драўляная, захавалася да нашага часу. Касцёл жа ў 1967-м разабралі, з яго пабудавалі клуб — а арган, званы і іконы зніклі альбо былі знішчаны. І толькі ў 1995 годзе з дапамогай польскай дыяспары касцёл пачалі будаваць наноў, у стылі сучаснай готыкі. І сёння грамадзяне Польшчы прыязджаюць да нас на магілы продкаў, а дзякуючы галандцам у Асавой з'явіўся арган — на ім іграе Аляксандр Карповіч.

Блізу касцёла пахаваныя адны толькі каталікі з наваколляў — напрыклад, тут знаходзіцца магіла Дамініка Орды, які быў прыхільнікам Напалеона Банапарта. Таксама, паводле ўспамінаў Яна Колба-Сялецкага, тут маглі быць пахаваныя паўстанцы Рамуальда Траўгута (беларускі шляхціч, баявы афіцэр, атрад якога вясной 1863-га меў некалькі сутычак з рэгулярнымі войскамі) — Вішнеўскі, Бандзкевіч і Пятроўскі, дакладныя месцы пахавання якіх невядомыя. На цвінтары знаходзіцца магіла ўдзельніка Першай сусветнай вайны, кавалера Георгіеўскага крыжа Антона Цэзарэвіча Збарашэўскага. Прах выхадца з Асавой Тадэвуша Наздрын-Платніцкага таксама прывезлі для пахавання каля касцёла — ажно з далёкай Аўстраліі...

У вёсцы доўгі час была польская школа, пры ёй бібліятэка. Паблізу размяшчалася прыгожая сядзіба ляснічага Ежы Масакоўскага з вялікім садам, каля 100 дрэваў, і ліпавай алеяй. У яго ным доме ў 1938 годзе было адкрыта вучылішча швачак, першымі вучаніцамі сталі 11 дзяўчат — пра гэта згадвала колішняя вучаніца Аляксандра Давыдоўская. У суседніх Асаўцах, прыкладна за два кіламетры, быў панскі двор, конезавод Наздрын-Платніцкага, ветраны млын Юнкевіча, кузня Міклашэўскага, карчма Фышко, таксама там жылі некалькі яўрэйскіх сем'яў.

Лясы былі такія багатыя, што на паляванне ў асаўскія бары ў 1937 годзе прыязджалі з Манькавіч Караль Радзівіл і Рыдз-Сміглы, кіраўнік польскага ўрада з Варшавы.

У 1944 годзе ў былой леснічоўцы пачала працаваць беларуская школа, якая з пачатковай паступова вырасла ў сямігодку і пад кіраўніцтвам Мяфодзія Сямёнавіча Сулкоўскага стала самай перадавой у раёне. Па звестках на 1967 год, у вёсцы дзейнічала сярэдняя школа і дзіцячы садок, крама, дом культуры. А сёння ў дадатак да пералічанага ёсць яшчэ басейн, каля якога знаходзіцца прыгожы парк Перамогі — тут устаноўлены абеліск у памяць загінулых у Вялікай Айчыннай вайне.

Летась Асавая мела гонар прымаць раённыя дажынкі — вёску ўпарадкавалі, прыбралі, як мае быць, абгарадзілі парк, спілавалі небяспечныя дрэвы. А дом культуры ператварылі адначасова і ў дом быту, і ў сацыяльна-культурную ўстанову: на першым паверсе знаходзіцца паштовае аддзяленне, комплексна-прыёмны пункт і ФАП, на другім — бібліятэка і музей, зладжаны мясцовым краязнаўцам Міколам Кавалёвым.

За тры кіламетры ад вёскі праходзіць чыгунка, ёсць станцыя Відзібор, да якой падведзены ўжо газаправод. Людзі такім пераменам не нарадуюцца, і можна ўпэўнена сказаць — вёска мае не толькі слаўнае мінулае, але і будучыню.

**Марыя МАЛЕЙ,**
*в. Асавая Столінскага раёна.*

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27., тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
Продавец: ОАО «Крупский плодоовощной завод» (УНП 600025392) в лице ликвидатора ООО «Партнер-Консультант», тел. +375 (17) 395-58-91.
Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **26 ноября 2019 г**. **09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Емкость 7 $м^3$, инв. № 4290753 | 600,00 |
| 2 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290754 | 1080,00 |
| 3 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290755 | 1080,00 |
| 4 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290756 | 1080,00 |
| 5 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 429757 | 1080,00 |
| 6 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 450103 | 1080,00 |
| 7 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 450104 | 1080,00 |
| 8 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 450105 | 1080,00 |
| 9 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 450106 | 1080,00 |
| 10 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 450107 | 1080,00 |
| 11 | Емкость 15 $м^3$, инв. № 4290964 | 1080,00 |
| 12 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290782 | 1080,00 |
| 13 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290780 | 1080,00 |
| 14 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290781 | 1080,00 |
| 15 | Емкость 20 $м^3$, инв. № 4290758 | 1200,00 |
| 16 | Емкость 20 $м^3$, инв. № 4290760 | 1200,00 |
| 17 | Емкость 20 $м^3$, инв. № 4290759 | 1200,00 |
| 18 | Емкость 50 $м^3$, инв. № 4290752 | 2880,00 |
| 19 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290762 | 1080,00 |
| 20 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290761 | 1080,00 |
| 21 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290763 | 1080,00 |
| 22 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290764 | 1080,00 |
| 23 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290765 | 1080,00 |
| 24 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290768 | 1080,00 |
| 25 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290769 | 1080,00 |
| 26 | Емкость 16 $м^3$, инв. № 4290770 | 1080,00 |
| 27 | Бракиражная машина В6-ВИА, инв. № 450062 | 330,00 |
| 28 | Машина моечная АММ 6, инв. № 450061 | 1944,00 |
| 29 | Автомат для укупорки Л5-ВУВ, инв. № 450124 | 1020,00 |
| 30 | Этикетировочный автомат Л5-ВЭ2М, инв. № 450064 | 1380,00 |
| 31 | Вибробункер Л5-ВБК, инв. № 450074 | 174,00 |
| 32 | Устройство для переворачивания В6-ВИА, инв. № 450125 | 330,00 |
| 33 | Машина фасовочная Д9-ВРЕ6, инв. № 450076 | 2280,00 |
| 34 | Автомат наклеивания марок АНМК-4, инв. № 450065 | 840,00 |
| 35 | Водонагреватель, инв. № 450113 | 96,00 |
| 36 | Комплект транспортеров Б-2 | 1944,00 |
| 37 | Котел паровой Е-1,0-0,9Р-3 (Э), инв. № 430114 | 5460,00 |
| 38 | Розливочный аппарат | 1020,00 |
| 39 | Котел паровой Е-1,0-0,9Р-3 (Э) | 5460,00 |
| 40 | Центрифуга | 72,00 |

Местонахождение – г. Крупки, тел. для ознакомления +37529 698-53-53.
**Для участия в торгах необходимо в срок по 25.11.2019 г. до 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку на участие в торгах по выбранному лоту на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 26.09.2019 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕо проведении повторного открытого аукциона по продаже объекта недвижимости ОАО «Белимпортторг»

**ОАО «Белимпортторг» объявляет открытый аукцион по продаже**

**Лот № 1:** капитального строения с инвентарным номером 100/С-7139, площадью 3781,6 кв. м (назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001031340, площадью 0,5901 га. Земельный участок принадлежит ОАО «Белимпортторг» на праве постоянного пользования. Составные части и принадлежности капитального строения: асфальтовое покрытие (литер б), ливневая канализация (литер в), внутриплощадочная канализация (литер г), внешние сети водопровода (литер д), наружные теплосети (литер е), наружное освещение (литер ж), низковольтные сети (литер и) по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Инженерная,19В.

Справочно: 1632,9 кв. м площадей капитального строения находится в аренде.

Начальная цена продажи с НДС (20 %) составляет 1 740 000,00 (один миллион семьсот сорок тысяч) белорусских рублей. Сумма задатка составляет 174 000,00 (сто семьдесят четыре тысячи) белорусских рублей.

**Лот № 2:** изолированного помещения с инвентарным номером 100/D-21411, площадью 1045,4 кв. м (назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование: помещение блока № 1 и № 2) (гараж), находящегося в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-7150, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000001019655, площадью 0,2627 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Инженерная, 19. Земельный участок принадлежит ОАО «Белимпортторг» на праве общего долевого постоянного пользования.

Начальная цена продажи с НДС (20 %) составляет 355 200,00 (триста пятьдесят пять тысяч двести) белорусских рублей. Сумма задатка составляет 35 520,00 (тридцать пять тысяч пятьсот двадцать) белорусских рублей.

Задаток перечисляется на расчетный счет BY76 PJCB 3012 5021 8210 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 500 г. Брест, (б-р Шевченко, 6/1, г. Брест), БИК PJCBBY2X, УНП 200020512, в срок, установленный для приема заявления и необходимых документов на участие в аукционе.

**Открытый аукцион состоится 29 ноября 2019 года в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, 224024, г. Брест, ул. Инженерная, 19, 3-й этаж, актовый зал.**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан заключить договор купли-продажи не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата производится Покупателем в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи. Обязательным условием в договоре купли-продажи является обязанность Покупателя возместить расходы Продавца по проведению рыночной оценки предмета аукциона, а также на публикацию в средствах массовой информации.

Торги проводятся в соответствии с законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже основных средств, принадлежащих ОАО «Белимпортторг», утвержденным организатором торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 (три) календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по адресу: 224024, г. Брест, ул. Инженерная, 19, в рабочие дни по **26 ноября 2019 года** включительно с 09.00 до 16.00.

**Организатор аукциона – ОАО «Белимпортторг». Контактные телефоны: (8-0162) 45-56-44, 45-52-45, тел./факс 45-53-38, e-mail: entbit@brest.by, www.belimporttorg.by.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С., извещает о проведении 22 ноября 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел.руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** **1)** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2)** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3)** Земельный участок под объект продажи **(лоты №№ 1, 3)** будет выделен согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается) | | | |
| **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Информация о земельном участке:** лоты №№ 1, 3 расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **10,6664 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания производственных зданий завода | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-13341**, площадью **758,3 кв. м**, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – **двухэтажное кирпичное здание столовой на 84 посадочных мест, с подвалом, пристроенным кирпичным складом.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | **379 800,00** | 37 980,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-36935**, площадью **139,5 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание нежилое.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8, корп. 16 | **18 684,00** | 1 868,40 |
| 4 | Плоскошлифовальный станок 3Б722, инв. № 50012 | **4 410,00** | 441,00 |
| 5 | Вертикально-фрезерный станок СФ40ПФ1-010, инв. № 50337 | **3 690,00** | 369,00 |
| 6 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135, инв. № 50011 | **1 350,00** | 135,00 |
| 7 | Координатно-расточной станок 2Е440А, инв. № 50001 | **3 780,00** | 378,00 |
| 8 | Радиально-сверлильный станок 2М55, инв. № 50002 | **3 420,00** | 342,00 |
| 9 | Фрезерный станок «Орша» Ф32Ш*31, инв. № 61285 | **17 190,00** | 1 719,00 |
| 10 | Настольно-сверлильный станок, инв. № 60426 | **531,00** | 53,10 |
| 11 | Настольно-сверлильный станок ГС2116К, инв. № 61343 | **4 500,00** | 450,00 |
| 12 | Токарно-винторезный станок ГС526У-01, инв. № 60790 | **11 700,00** | 1 170,00 |
| 13 | Токарно-винторезный станок ГС526УВД1-02, инв. № 61294 | **13 230,00** | 1 323,00 |
| 14 | Станок 3Б633, инв. № 50101 | **891,00** | 89,10 |
| 16 | Кругло-шлифовальный станок 3Б12, инв. № 50014 | **2 070,00** | 207,00 |
| 17 | Фрезерный станок 675ПФ1, инв. № 50279 | **2 160,00** | 216,00 |
| 19 | Установка для воздушно-плазменной резки УВПР-0901, инв. № 60595 | **2 430,00** | 243,00 |
| 20 | Печь муфельная SNOL 30/1300, инв. № 60701 | **1 620,00** | 162,00 |
| 21 | Станок 4К722АФ-1, инв. № 50372 | **5 670,00** | 567,00 |
| 22 | Кран-балка электрическая г/п 2 тн, инв. № 50132 | **2 160,00** | 216,00 |
| 23 | Кран электрический, г/п 2 тн, инв. № 50121 | **2 520,00** | 252,00 |
